Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ЖНІЎНЯ 2019 г. СУБОТА № 150 (29017)

АКАДЭМІЧНАЯ МУЗЫКА І БЕЛАРУСЫ 8

КАЛІ НЕАБХОДНЫ ПСІХІЯТР 10

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ГАЕЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:

«У краіне створаны заканадаўчыя ўмовы і ёсць усе неабходныя інструменты для таго, каб уключаць у гаспадарчы абарот маёмасць, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца ці наогул не выкарыстоўваецца, патрэбна толькі зладжаная работа на ўсіх узроўнях — ад камунальнага да рэспубліканскага. Лічбы па выніках работы ў першым паўгоддзі сведчаць, што сітуацыя пакуль не ідэальная. Несумненна, працэнт уключэння ў абарот падцягнецца. Па выніках года мы чакаем, што ў дачыненні да такіх спосабаў, як бязвыплатная перадача аб'ектаў ва ўласнасць, здача ў арэнду, а таксама ў частцы зносу лічба будзе больш чым 90 %. Час для дасягнення запланаванага ёсць, Дзяржкаммаёмасць са свайго боку гатова аказваць усю неабходную дапамогу».

САКАВІТЫ ЖНІВЕНЬ

Фота БелТА.

Менавіта такім ён выдаўся ў гаспадарцы «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Кіраўскага раёна. У мясцовых садах, якія займаюць тут больш за 220 гектараў, ужо сабрана і рэалізавана праз фірмовы гандаль каля 100 тон яблыкаў. Але большасць пладоў яшчэ даспявае на дрэвах, таму зборшчыкам сакавітага ўраджаю, сярод якіх Аніта ПІШЧЫК *(на фота)*, работы яшчэ хопіць.

КАРАТКА

• Заўтра ў Беларусі адзначаюць Дзень будаўніка. З прафесійным святам будаўнікоў краіны павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

• **500 гадоў адсвяткуе 23—25 жніўня горад Івацэвічы Брэсцкай вобласці.**

• Партыя бязвыплатнай дапамогі ў выглядзе выратавання медыцынскага прызначэння прыбыла ў Беларусь з ЗША.

• **Запіску з прывітаннем больш чым 50-гадовай даўніны знайшлі ў танку-помніку ў Гродне.**

Клуб «Залатыя рукі»

WORLDSKILLS — НЕ СПОРТ

Дэвіз сусветнага руху — «Удасканальвай свет прафесійнымі навыкамі»

З 22 да 27 жніўня ў Казані пройдзе 45-ы чэмпіянат WorldSkills International, у якім возьмуць удзел і беларусы. Размова ідзе пра самы прэстыжны ў свеце конкурс прафесійнага майстэрства.

Галоўная яго мэта — папулярызацыя рабочых прафесій у сучасным грамадстве, у тым ліку праз правядзенне міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве. Удзельнічаць у іх могуць навучэнцы прафесійных устаноў адукацыі (у тым ліку і студэнты ВНУ) ці маладыя спецыялісты ва ўзросце да 22 гадоў (у асобных кампетэнцыях — да 25 гадоў).

На сённяшні дзень асацыяцыя WorldSkills International аб'ядноўвае 78 краін-удзельніц, дзе пражывае больш за 70 працэнтаў насельніцтва зямнога шара. Спаборніцтвы праводзяцца кожныя два гады ў міжнародным фармаце на працягу ўжо больш як 60 гадоў. Для ўдзелу ў чэмпіянаце, які прыме ў канцы жніўня Казань, зарэгістравалася больш за 1,5 тысячы ахвотных з 63 краін. За работай канкурсантаў будуць сачыць дзве тысячы экспертаў. Адкуль такая вялікая цікавасць у свеце да руху WorldSkills?

СТАР. 4

НЕ ТАННА, А ЯКАСНА: НА ШКОЛЬНЫМ БАЗАРЫ З КСЕНІЯЙ ГАЛЕЦКАЙ

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Айчынныя вытворцы, падрыхтаваўшыся да новага навучальнага года, выпусцілі новыя мадэлі адзення і абутку дзелавога стылю, шырокі асартымент канцылярскіх прылад, заплечнікаў і г. д. У МАРГ, дарэчы, падлічылі, у якую сумму абыдзецца поўная «аптымальная экіпіроўка» для вучняў малодшых класаў. Але гэта ў тэорыі, а што выбіраюць на практыцы самі вучні і бацькі? Карэспандэнт «Звязды» пабывала на адным са школьных кірмашоў сталіцы з пераможцай дзіцячага конкурсу «Славянскага базару ў Віцебску — 2019» Ксеніяй ГАЛЕЦКАЙ, якая сёлета пойдзе ў 7 клас, і яе мамай Ірынай.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

БУДУЧЫНЯ — У ЛІЧБЕ

Аляксандр Лукашэнка наведаў адзін з аб'ектаў урадавай сувязі КДБ

Прэзідэнту далажылі аб ажыццяўленні дзяржаўных праграм у сферы ўрадавай сувязі, перспектывах развіцця галіны, распрацоўцы сістэм рухомай урадавай радыёсувязі. Кіраўніку краіны прадэманстравалі ўзоры тэхнікі спецыяльнай сувязі, створаной беларускімі прадпрыемствамі, лінейку сродкаў сувязі і апаратуры шыфравання, у тым ліку абароненай мабільнай тэлефоннай сувязі.

У выніку рэалізацыі праграм адбыўся пераход ад аналагавага да лічбавага абсталявання. Распрацоўка і ўвод у карыстанне айчыннай тэхнікі і апаратуры шыфравання забяспечылі імпартазамяшчэнне.

Абароненасць, якасць і надзейнасць — галоўныя крытэрыі ў мадэрнізацыі ўрадавай сувязі.

Таксама кіраўніку дзяржавы паказалі рухомы комплекс тэхнічнага кіравання контртэрарыстычнай аперацыяй. Установка, якая цяпер праходзіць дзяржаўныя выпрабаванні, здольная запускаць дроны, выяўляць і нейтралізаваць беспілотнікі.

«Гэта будучыня. Канешне, мы разviццё ўсяляк падтрымліваем. На гэта грошай шкадаваць не трэба, я цвёрда перакананы. Але пасля таго як альтэрнатыўныя падраздзяленні мне дакладуць, што вы сапраўды эфектыўныя, вычарпалі ўсякія рэзервы і вам патрэбна дапамога», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Акцэнт, на думку лідара краіны, неабходна зрабіць на распрацоўцы якаснага і надзейнага прадукту.

«Не можаце — не рабіце. Доўга вам яго трэба рабіць — рабіце спакойна. Але не бярыцеся за тое, што не можаце. Патрэбна будзе падтрымка — вы заўсёды яе атрымаеце, але не рабіце дрэннага прадукту», — цытуе словы Прэзідэнта БелТА.

Прыёмная кампанія

Моладзь выбірае ІТ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі набраў сёлета рэкордную колькасць першакурснікаў. Па словах рэктара БДУІР Вадзіма БОГУША, на ўсе формы атрымання адукацыі першай ступені было залічана больш за 3,5 тысячы чалавек.

— Гэта адэкватны адказ на тыя выклікі і запыты, якія ёсць з боку нашых заказчыкаў кадраў, — падкрэсліў Вадзім Богуш. — Хачу адзначыць, што толькі за апошнія два гады мы амаль на 600 чалавек павялічылі аб'ёмы падрыхтоўкі. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў сёлета два чалавекі на месца.

Верхняя мяжа прахадных балаў сур'ёзна не змянілася. Напрыклад, на такую традыцыйна папулярную ў моладзі спецыяльнасць, як «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», прахадны бал на бюджэт быў 360, а на платную форму трэба было набраць 309 балаў. «Гэта сведчыць пра тое, што ў нашу ВНУ прыходзіць вельмі моцны кантынгент выпускнікоў, якія здольныя асвойваць інтэнсіўныя і складаныя навучальныя праграмы», — адзначыў Вадзім Богуш.

Сярэдні бал абітурыентаў, якія паступілі на дзённую бюджэтную форму навучання, склаў 349, што на дзесяць балаў больш, чым у 2018-м. Пры гэтым сярэдні бал залічаных на платную форму — 282. Кожны шосты ўладальнік стабальнага сертыфіката падаў свае дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Пры гэтым большасць уладальнікаў стабальных вынікаў набралі максімальную «сотню» па матэматыцы, якая з'яўляецца профільнай дысцыплінай для ІТ-спецыяльнасцяў.

БДУІР вядзе падрыхтоўку па 30 спецыяльнасцях на першай ступені, зместякіх штогод абнаўляецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АГУЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ — АДЗІНЫЯ РЫНКІ

Работу па стварэнні роўных умоў гаспадарання на агульнай прасторы ЕАЭС неабходна працягваць

Пра гэта на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета ў Чалпон-Аце (Кыргызстан) заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас. На яго думку, адпаведная работа ў гэтым кірунку ўжо вядзецца, і ўдзельнікі Саюза вучацца прымаць рашэнні нацыянальнага ўзроўню з аглядкай на абавязацельствы ў ЕАЭС.

У той жа час яшчэ выклікаюць складанасці пытанні па асаблівасцях работы на рынках краін Саюза, доступе да дзяржзакупак, спецыфіцы субсідзіравання нацыянальных вытворцаў, арганізацыі транзіту, мытна-тарыфных мерах і іншыя.

У сакавіку гэтага года ўступіла ў сілу Пагадненне аб маркіроўцы тавараў сродкамі ідэнтыфікацыі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, але іх укараненне не павінна стаць яшчэ адным інструментам стрымлівання ўнутранага гандлю. Беларускі бок лічыць, што найбольшы эфект ад рэалізацыі пагадненне будзе дасягнуты пры ўдзеле ў працэсе ідэнтыфікацыі таварных патокаў усіх дзяржаў-членаў.

Найбольш важная задача для Саюза сёння — пераход да ўзгодненай, а ў будучыні і да адзінай прамысловай, аграпрамысловай палітыкі.

«Супрацоўніцтва ў прамысловасці і АПК дазволіць выйсці на новыя інавацыйныя праекты ў Еўразійскім эканамічным саюзе, значна нарасціць аб'ёмы выпуску канкурэнтнай высокатэхналагічнай прадукцыі, спрыяюць рэалізацыі праграм імпартазамяшчэння», — сказаў Сяргей Румас.

Трэба працягнуць работу над фарміраванне агульных рынкаў ЕАЭС — энергетычнага, транспартнага, фінансавага.

Учора на палях саміта адбылася сустрэча беларускага прэм'ер-міністра з яго расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым. З беларускага боку ў сустрэчы таксама ўдзельнічалі віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка, міністр эканомікі Дзмітрый Крутой, першы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка, намеснік міністра фінансаў Дзмітрый Кійко.

Наступнае пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета пройдзе ў Маскве ў кастрычніку.

Паводле БелТА.

Выбары-2019

ПА ІНФАРМАЦЫЮ — НА САЙТ

Асноўныя вехі выбарчай кампаніі асвятляюцца ў інтэрнэце

Аднавіў дзейнасць спецыяльны інфармацыйны рэсурс Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў «Выбары-2019», дзе будуць асвятляцца ўсе найважнейшыя падзеі кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання.

На працягу трох месяцаў **старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА** будзе інфармаваць выбаршчыкаў аб галоўных падзеях, што адбыліся ў выбарчай кампаніі. Так, у першым сваім відэазвароце Лідзія Ярмошына паведаміла, што палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы і грамадзяне маюць права падаваць дакументы аб вылучэнні сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій да 30 жніўня ўключна.

ГАЛАСАВАННЕ Ў ПЫТАННЯХ І АДКАЗАХ

Вывучаем інфармацыю на сайце Цэнтрвыбаркама, каб разабрацца ў палітычных падзеях, што маюць адбыцца ўвосень. Даём адказы на распаўсюджаныя пытанні чытачоў.

— Выбары прызначаныя на 7 і 17 лістапада. Гэта значыць, што мне трэба будзе двойчы прыходзіць на выбарчы ўчастак?

Не, толькі 17 лістапада — прагаласаваць за кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, які выбіраецца непасрэдна грамадзянамі. А на 7 лістапада прызначаны выбары членаў Савета Рэспублікі — іх выбіраюць дэпутаты мясцовых Саветаў.

Прэзідыумы мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы з 9 верасня да 8 кастрычніка ўключна вылучаюць кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Мясцовыя Саветы выбіраюць 56 членаў — па 8 ад кожнай вобласці і Мінска, яшчэ 8 сенатараў прызначае кіраўнік дзяржавы. Пры правядзенні выбараў маюць права прысутнічаць назіральнікі. Выбраным лічыцца кандыдат у члены Савета Рэспублікі, які атрымаў больш за палову галасоў дэпутатаў, што прынялі ўдзел у галасаванні.

Пасяджэнне дэпутатаў мясцовых Саветаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі склікаецца не пазней за 35 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі. Устанаўленне вынікаў выбараў і рэгістрацыя выбраных членаў адбудуцца не пазней за 22 лістапада.

Кандыдатам у члены Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў узросту 30 гадоў і пражыў на тэрыторыі адпаведнай вобласці, Мінска не менш за пяць гадоў.

Кандыдатамі ў члены верхняй палаты не могуць быць вылучаныя грамадзяне, якія не маюць права займаць пасады ў дзяржаўных органах і іншых дзяржарганізацыях у сувязі з наяўнасцю судзімасці.

— Я — грамадзянін Беларусі. Ці магу я стаць парламентарыем?

Так. Калі вам споўніўся 21 год, вы стала пражываеце на тэрыторыі рэспублікі і не маеце судзімасці, вы можаце балатавацца ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, у складзе якой — 110 дэпутатаў.

Кандыдат у дэпутаты ніжняй палаты парламента можа быць вылучаны палітычнай партыяй, працоўным калектывам альбо грамадзянамі шляхам збору подпісаў. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пройдзе з 8 верасня да 7 кастрычніка ўключна, рэгістрацыя кандыдатаў — з 8 да 17 кастрычніка ўключна.

— У лістападзе я буду ў камандзіроўцы за мяжой. Дык што, я не змагу прагаласаваць?

Зможаце. Па-першае, выбарчае заканадаўства прадугледжвае датэрміновае галасаванне па месцы знаходжання (санаторыі, дамы адпачынку, бальніцы, воінскія часці і іншае) грамадзян, якія па ўважлівых прычынах не змогуць у дзень выбараў прыйсці ў памяшканне для галасавання. Па-другое, калі вы за мяжой, можна прагаласаваць на ўчастку, які ўтвораны дыпламатычным прадстаўніцтвам Беларусі.

На ўчастку для галасавання, утвораным за межамі Беларусі, галасуюць грамадзяне краіны, якія пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы ці знаходзяцца ў працяглай камандзіроўцы, а таксама якія наведваюць замежную дзяржаву ў сувязі з прыватнай, службовай, дзелавой ці турыстычнай паездкай. Так, на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў папярэдняга, шостага, склікання дзейнічала 47 участкаў за межамі Беларусі.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мінсельгас Расіі не падтрымаў ідэю забараніць знішчэнне санкцыйных прадуктаў

Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ не падтрымала ідэю ўвесці забарону на знішчэнне забароненых да ўвозу прадуктаў, падкрэсліўшы, што яе рэалізацыя можа спрыяць пашырэнню нелегальнага абароту.

Гэта вынікае з адказу ведамства на запыт камітэта Дзярждумы па эканамічнай палітыцы «Аб магчымасці ўвядзення забароны на знішчэнне прыдатных да ўжывання прадуктаў», накіраваны пасля пратакольнага даручэння ніжняй палаты парламента.

У лісце намесніка кіраўніка Мінсельгаса Аксаны Лут гаворыцца, што ўвядзенне забароны на знішчэнне «можа стварыць дадатковыя ўмовы для нелегальнага абароту забароненых да ўвозу тавараў, у тым ліку і такіх, што ўяўляюць патэнцыйную небяспеку ў сувязі з парушэннем правілаў увозу тавараў». Акрамя таго, Лут адзначыла, што ў адпаведнасці з заканадаўствам РФ «спецыяльныя эканамічныя меры носяць часовы характар, а канкрэтныя дзеянні ў рамках спецыяльных эканамічных мер могуць мяняцца ў адпаведнасці з тым, як развіваецца знешняя эканамічнае і палітычнае становішча». У сувязі з гэтым «Мінсельгас Расіі ў дачыненні да забароненай да ўвозу прадукцыі прытрымліваецца пазіцыі па знішчэнні такой прадукцыі», падкрэсліваецца ў лісце.

Становішча на вуліцах Бішкека пасля начных беспарадкаў нармалізавалася

Жыццё ў сталіцы Кыргызстана вярнулася ў ранейшае рэчышча пасля начных беспарадкаў з удзелам прыхільнікаў затрыманага ў чацвер экс-прэзідэнта Алмазбека Атамбаева. На галоўнай плошчы Ала-Тоа і прылеглых да яе вуліцах абстаноўка спакойная, перадае ў пятніцу з Бішкека карэспандэнт ТАСС.

Ужо раніцай у пятніцу ў цэнтры Бішкека з цяжкасцю можна было выявіць сляды начных беспарадкаў, учыненых групай агрэсіўна настроеных маладых людзей, якія выйшлі на плошчу Ала-Тоа, пасля таго як даведаліся пра затрыманне былога кіраўніка дзяржавы.

Тым часам стала вядома, што былы кандыдат у прэзідэнты Кіргізіі Амурбек Бабанаў вярнуўся ў пятніцу ў сталіцу рэспублікі, дзе супраць яго распачатая крымінальная справа. Раней Дзяржаўны камітэт нацыянальнай бяспекі распаўсюдзіў паведамленне аб тым, што Бабанаў у выпадку вяртання на радзіму абавязкова будзе затрыманы.

Амурбек Бабанаў з'яўляецца заснавальнікам і лідарам папулярнай у краіне партыі «Рэспубліка». У 2017 годзе ён балатаваўся ў прэзідэнты і заняў другое месца, набраўшы каля 34 % галасоў. Ён прапусціў наперад толькі цяперашняга кіраўніка дзяржавы Сааранбая Жээнбекава, за якога прагаласавала крыху больш за палову выбаршчыкаў.

Праз некалькі дзён пасля выбараў палітык вымушаны быў з'ехаць з Кыргызстана, бо ў дачыненні да яго была ўзбуджаная крымінальная справа.

ФБР захацела таемна сачыць за карыстальнікамі сацсетак

Федэральнае бюро расследаванняў ЗША шукае прыватныя кампаніі-падрадчыкі, якія змогуць збіраць і перадаваць у праваахоўныя органы велізарныя аб'ёмы даных карыстальнікаў такіх сацыяльных сетак, як Twitter, Facebook і Instagram. Пра гэта гаворыцца ў заяўцы на правядзенне тэндара, паведамляе CNN.

Адзначаецца, што пошукам ФБР занялося яшчэ ў ліпені. У дакументе ўказваецца, што амерыканскі ўрад мае патрэбу ў «доступе да ўсяго абмену данымі ў сацыяльных сетках у рэальным часе», каб лепш змагацца з тэрарыстамі і ўнутранымі пагрозамі.

Для гэтага бюро шукае правайдараў, якія будуць загадзя папярэджваць праваахоўныя органы аб падрыхтоўцы магчымых інцыдэнтаў з прымяненнем насілля, а таксама пры неабходнасці змогуць раскрыць ідэнтыфікацыйныя нумары карыстальнікаў у сацыяльных сетках, іх IP-адрасы і нумары тэлефонаў.

Будзь у курсе!

Паветраны duty free

У Беларусі вызначаны парадак бяспошліннага гандлю на бартах паветраных суднаў. Адпаведны ўказ № 296 падпісаў Прэзідэнт Беларусі. Інфармацыя пра гэта з'явілася на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Дакумент прыняты з мэтай пашырэння бяспошліннага гандлю пры міжнародных паветраных перавозках пасажыраў беларускімі авіяцыйнымі арганізацыямі. Устаноўлена, што на бартах паветраных суднаў дазваляецца рэалізацыя шляхам разноснага гандлю тавараў, у тым ліку алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў, загружаных з крам бяспошліннага гандлю для выкарыстання ў якасці прыпасаў, якія вывозяцца з мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза. Тавары будуць рэалізоўвацца ў адпаведнасці з заключанымі паміж уладальнікамі крам бяспошліннага гандлю і беларускімі авіяцыйнымі арганізацыямі дамовамі аб супрацоўніцтве.

ДАІ праводзіць акцыю «Дзяржтэхагляд»

Мерапрыемства адбываецца з 7 да 17 жніўня і ініцыявана ў сувязі з ростам здарэнняў з прычыны тэхнічных няспраўнасцяў аўтамабіляў. Такую інфармацыю ў сваім Telegram-канале размясціла афіцыйны прадстаўнік МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.

У названую дэкаду ў розных населеных пунктах супрацоўнікі ДАІ правераць у кіроўцаў допуск да ўдзелу ў дарожным руху іх транспартных сродкаў. У МУС заклікалі аўтаўладальнікаў адказна паставіцца да падтрымання свайго транспарту ў спраўным стане і нагадалі, што своечасова пройдзены тэхагляд — залог бяспекі ўсіх удзельнікаў дарожнага руху. Штодня ДАІ аналізуе прычыны росту ДТЗ. Адна з іх — тэхнічныя няспраўнасці транспартных сродкаў. Сёлета адбылося восем такіх аварый, у якіх тры чалавекі загінулі і 27 атрымалі раненні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Футбол

У ЕЎРАКУБКАХ ГАЛОЎНАЕ — ВЫНІК

Футбалісты барысаўскага БАТЭ абыгралі «Сараева» 2:1 у першым матчы 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. Лік адкрыў Дзмітрый Бага, павялічыў яго Эрвейн Мукам, рэалізаваўшы пенальці.

— Самае прыгожае ў футболе — лічбы на табло. Мы выйгралі 2:1 і едзем дадому з перамогай. У еўракубках галоўнае — вынік, і мы яго дамагліся, — адзначыў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** — Я ацаніў бы гэты матч станоўча для нас: атрымалі перамогу на выездзе над моцнай камандай, двойчы вызначыліся, хлопцы зрабілі добрую работу. Дзве добрыя запальніцы з трыбуны мне прыляцелі — забяру на сувеніры. А так атмасфера на стадыёне фантастычная, шыкоўная — мне вельмі спадабалася. Думаць над планам на матч у адказ станем пазней, да таго яшчэ 11 жніўня праводзіць сустрэчу чэмпіянату Беларусі. Трэба зрабіць аналіз сённяшняй гульні, паглядзець на стан хлопцаў. Але ўжо цяпер зразумела: на «Барысаў-Арэне» будзе няпросты пядынак, таму што «Сараева» — добрая каманда.

Фота БелТА.

Сустрэча ў адказ пройдзе 15 жніўня на полі «Барысаў-Арэны». Пераможца двухматчавага супрацьстаяння беларускага і баснійскага чэмпіёнаў паспрачаецца за выхад у групавы этап Лігі Еўропы з найлепшым пераможцам пары «Астана» (Казахстан) — «Валета» (Мальта). У першай гульні казахстанскі клуб разграміў сапернікаў на сваім полі з лікам 5:1

Салігорскі «Шахцёр» на турнірнай «Стадыё Алімпіка» пацярпеў паражэнне ад італьянскага «Тарына» — 0:5. Паядынак у адказ адбудзецца 15 жніўня на полі мінскага стадыёна «Дынама».

— У раздзявальні ўжо сказаў камандзе, што трэба не тое каб правесці правільны аналіз, — трэба спакойна ўспрыняць гэтую сітуацыю. Таму што яна аказалася сумай складнікаў розных момантаў, — адзначыў **галоўны трэнер «Шахцёра» Сяргей ТАШУЕЎ.** — Я гэта кажу да таго, што крытыкаваць хлопцаў цяпер проста няма сэнсу. Яны рабілі, што маглі. І такое адчуванне, што гэтыя пяць мячоў мы забілі сабе самі. У матчы ў адказ з «Тарына» склад у нас будзе крыху іншы, і, магчыма, усё ж такі вернем сваю схему і расстаноўку. Паспрабуем даць бой, каб дасягнуць станоўчага выніку.

Пераможца беларуска-італьянскай двухматчавай дуэлі паспрачаецца ў барацьбе за выхад у групавы этап Лігі Еўропы з найлепшай камандай пары «Пюнік» (Арменія) — «Вулверхэмптан» (Англія). У першай гульні ў Ерэване з лікам 4:0 перамог англійскі клуб.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

У МІНСКУ ПРАДСТАВІЛІ НОВЫ МАЗ

Мінскі аўтамабільны завод да свайго 75-годдзя выпусціў першы аўтобус трэцяга пакалення.

За 75-гадовую гісторыю МАЗ выпусціў больш за 2 мільёны адзінак аўтатэхнікі.

У новай мадэлі распрацоўшчыкі вырашылі сумясціць еўрапейскі дызайн з нацыянальнымі традыцыямі. Першынцам трэцяга пакалення стаў нізкападлогавы МАЗ-303. У «анфас» ён падобны да «міжгародніка», а зверху мае каларытную гарбінку, якая павінна нагадваць сілуэт зубра.

«Такіх аўтобусаў у Беларусі яшчэ не было. Многія элементы і дызайнерскія рашэнні ўжытыя намі ўпершыню. Яны задаюць тон і збольшага дэманструюць, як будуць выглядаць новыя мадэлі МАЗ. Нам было важна стварыць стыльны еўрапейскі аўтобус, які пры гэтым захаваў бы пераемнасць і перадаваў этнакультурны каларыт», — растлумачылі новы выгляд аўтобусаў на Мінскім аўтазаводзе.

Габарыты новай мадэлі: даўжыня — 12,43 метра, шырыня — 2,55 метра, вышыня — 3,1 метра. Салон размесціць да 110 пасажыраў у залежнасці ад камплектацыі, з іх 26 — на сядзеннях, магчымая таксама кампаноўка з 16 сядзеннямі на нізкай падлозе. МАЗ-303 абсталяваны турбадызельным рухавіком класа Еўро-6 ад Daimler магутнасцю 299 «коней».

Салон аўтобуса выкананы па еўрапейскіх стандартах. Унутры папрастарнела, а ў пярэдняй частцы з'явіліся паўтарачныя сядзенні, зробленыя з клопатам пра мам з дзецьмі, пенсіянераў і іншых пасажыраў. Старанна прадуманы поручні, да таго ж на цэнтральнай пляцоўцы можна абаперціся на шырокую спінку. Вышыня падлогі — усяго 32 сантыметры, а для людзей на каляскаў усталяваная высоўная платформа з электрапрывадам.

Сярод навін — USB-парты для зарадкі смартфонаў і планшэтаў на ўсіх радах сядзенняў. За клімат у салоне адказваюць пяць ацяпляльнікаў і кандыцыянер, прычым апошні можа працаваць і на абагравanne. Месца кіроўцы таксама асучаснілі, зрабіўшы зручным і высокатэхналагічным. Камеры, напрыклад, забяспечаць 100-працэнтны агляд унутры і вакол аўтобуса.

Аўтобусы будуць прапаноўвацца для выкарыстання ў гарадах Беларусі, Расіі і іншых краін СНД. Чакаецца, што яны таксама атрымаюць «прапіску» ў еўрапейскіх гарадах і краінах Паўднёва-Усходняй Азіі.

Іван КУПАРВАС.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ВА ЎГОДДЗІ НА ПТУШКУ

У Беларусі з 10 жніўня адкрываецца летне-асенні сезон паляванне на птушыную дзічыну. Ён будзе доўжыцца да другой нядзелі снежня (8-е чысло), паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З другой суботы жніўня можна будзе паляваць на вадаплаўную і балотную дзічыну, акрамя гусі. Дазволена будзе таксама здабываць слонку, вяхіра, голуба шызага, перапёлку і фазана. Паляваць можна будзе ў светлы час наступнымі спосабамі: з засады, з падыходу, з пад'езду з выкарыстаннем маламерных суднаў без рухавіком або з выключанымі рухавікамі. Дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам, паляўнічых сабак усіх груп, акрамя ганчакоў і хартоў. Дапускаецца бяззброевае паляванне з лоўчымі птушкамі.

З першай суботы верасня будзе дазволена здабываць рабчыка і шэрую курапатку, а з трэцяй суботы — гусь белалобую, гусь-гуменніка, гусь шэрую і канадскую казарку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПВТ ЗАПРАШАЕ

на бясплатны анлайн-курс «Scratch 3.0 для пачаткоўцаў».

У першую чаргу ён будзе цікавы настаўнікам пачатковай школы і настаўнікам-прадметнікам, якія ніколі раней не праграмавалі і хочуць пазнаёміцца з новымі магчымасцямі выкарыстання ІТ на сваіх прадметах, а таксама педагогам, якія плануюць правядзенне факультатыўных заняткаў па Scratch у новым навучальным годзе. Як паведамляе прэс-служба ПВТ, анлайн-курс «Scratch 3.0 для пачаткоўцаў» вылучаецца граматным спалучэннем тэорыі і практыкі, выкладзены даступнай мовай і мае практычную скіраванасць.

Педагогі, якія паспяхова здалі тэсты і фінальнае творчае заданне, атрымаюць электронны сертыфікат. Для педагогаў, якія плануюць весці факультатыўныя заняткі і гурткі ва ўстановах адукацыі, будзе адкрыты доступ да вучэбна-метадычных матэрыялаў беларускай супольнасці Scratch.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАЦЯРПЕЛІ ВІЦЕБШЧЫНА І МІНСК

У выніку непагадзі ў чацвер пацярпелі рэгіёны Віцебскай вобласці і Мінск, былі зафіксаваныя адключэнні электраэнергіі.

Так, па інфармацыі МНС, пасля дажджу, які ішоў у сталіцы з 12 да 15 гадзін, былі падтопленыя дзесяць участкаў дарог. Выпала 16 міліметраў ападкаў пры сярэднямесячнай норме 81 міліметр у Заводскім і Партызанскім раёнах: адбылося спыненне руху (да дзвюх гадзін) 14 аўтобусных і 18 тралейбусных маршрутаў. Рух быў арганізаваны па аб'язных маршрутах.

У Віцебску ў выніку выпадзення ападкаў былі падтопленыя тры ўчасткі дарог, адбылося спыненне руху (да 3 гадзін 46 хвілін) 12 тралейбусных маршрутаў. Зафіксаваны 21 выпадак падзення дрэў, у выніку якіх пашкоджаны чатыры легкавыя аўтамабілі. Пацярпелых няма. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і ўборцы дрэў, якія ўпалі.

Па звестках «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны былі зафіксаваны адключэнні электраэнергіі ў 560 населеных пунктах. Яны аператыўна выпраўляліся аварыйнымі брыгадамі.

УКРАЎ ФУТРА ЗА 2500 ДОЛАРАЎ

Жыхарку прыватнага дома па вуліцы Будаўнікоў, што ў вёсцы Вуглы Барысаўскага раёна, абакраў невядомы. 48-гадовая жанчына пазбавілася дарагога нарказа футра. Са слоў заяўніцы, злодзей пранік у дом праз незачыненае акно.

Вывучыўшы ўсе абставіны здарэння, праваахоўнікі западозрылі ў крадзяжы 40-гадовага знаёмага гаспадыні дома, які незадоўга да злачынства знаходзіўся ў гасцях у пацярпелай, абодва ў той вечар распівалі спіртныя напоі. Аднак калі міліцыянеры пацікавіліся ў жанчыны, хто менавіта ў яе быў, назваць дакладныя даныя знаёмага тая не змагла, бо яны пазнаёміліся толькі напярэдадні. Атрымаўшы прыкметы злодзея, аператыўнікі ў самыя кароткія тэрміны ўстанавілі яго асобу і затрымалі ў Барысаве. Як аказалася, мужчына спланаваў злачынства загадзя: ён даведаўся, што ў новай знаёмай маецца дарагое футра, выбраў момант і ажыццявіў задуманае.

Па інфармацыі Барысаўскага РУУС, скрадзеную маёмасць ужо на наступны дзень зламыснік аддаў у заклад сваім сваякам за 150 долараў, хоць рынкавы кошт футра складае 5000 рублёў. Атрыманыя грошы мужчына пасля выдаткаваў на спіртное. За крадзеж фігурант крымінальнай справы можа быць пакараны пазбаўленнем волі да чатырох гадоў.

САГНАЎ ДВА АЎТАМАБІЛІ ЗА ДВА ДНІ

Учачы ў міліцыю паступіла паведамленне ад жыхара горада Мсціслава пра згон яго аўтамабіля «Мерседэс-Бенц-200» ад дома па вуліцы Кірава.

Гэтым жа вечарам аператыўнікамі крымінальнага вышуку аўтамабіль у тэхнічна спраўным стане быў знойдзены пад аўтамабільным мастом праз раку Віхру паблізу вёскі Пячкоўка. Вечарам наступнага дня паступіла аналагічнае паведамленне пра спробу згону аўтамабіля — гэтым разам «Аўдзі-80» з двара дома па вуліцы Астроўскага. Аўтамабіль быў знойдзены ўладальнікам за некалькі дзясяткаў метраў. Па адной з версій аператыўнікаў, гэтыя два згоны маглі быць звязаныя паміж сабой — менавіта так і аказалася. Па падазрэнні ў здзяйсненні гэтых злачынстваў быў затрыманы 21-гадовы раней судзімы за крадзяжы і хуліганства мясцовы жыхар.

Высветлілася, што падазраваны пасля распіцця спіртных напояў са знаёмымі, праходзячы па горадзе, звярнуў увагу на «Мерседэс». Сагнаўшы аўтамабіль, малады чалавек наведаўся да прыяцеляў у раёне. Аднак у транспартным сродку скончылася паліва паблізу вёскі Пячкоўка, дзе зламыснік яго і кінуў. Праз дзень ён разам з 19-гадовым прыяцелем паспрабаваў здзейсніць крадзеж «Аўдзі», але завесці рухавік у іх не атрымалася.

У Мсціслаўскім РАУС адзначаюць, што гэтыя згоны сталі вынікам бесклапотнасці саміх аўтаўладальнікаў: дзверы іх машын былі не замкнутыя, а ключы запальвання знаходзіліся ў салоне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Педагагічная майстэрня

АДКУЛЬ НАСТАЎНІКІ ЧЭРПАЮЦЬ НАТХНЕННЕ?

Прычыны сакрэту самага працяглага ў беларускай адукацыі праекта

Лета, ліпень, пачатак доўгачаканага настаўніцкага адпачынку. Яго чакаеш увесь год, рыхтуешся, выбіраеш маршруты для падарожжаў. Але для многіх беларускіх настаўнікаў адзін маршрут застаецца нязменным ужо шмат гадоў: Гродзенская вобласць, Астравецкі раён, бераг ракі Страча каля вёскі Альхоўка. Менавіта тут кожны год збіраюцца педагогі ў свой метадычны летнік, каб правесці незабыўны тыдзень творчасці і адкрыццяў.

Ідэя яго правядзення належыць Анатолю Бацюлеву і Мікалаю Запрудскаму. Яна нарадзілася падчас дэсанту нашых вядомых настаўнікаў фізікі ў Гродна шмат гадоў таму, а сёлета ўжо адбыўся юбілейны трыццаты летнік. Праект, які існуе столькі гадоў, варты ўвагі і заслугоўвае асаблівай павагі. Чаму? Паспрабую адказаць. Назаву сем прычын, чаму настаўнікі едуць у Альхоўку.

Прычына першая. Якім бы ні быў ваш вопыт педагагічнай дзейнасці, тут заўсёды ёсць чаму павучыцца. Тэма летніка кожны раз новая і запатрабаваная часам. Напрыклад, сёлета ў цэнтры ўвагі аказалася праектная навучанне. Каб патрапіць у летнік, трэба даслаць асабістую заяўку і прайсці пэўны конкурс, але для навічкоў адмоў амаль не бывае.

Прычына другая. Тут не бывае сумна і нецікава. Заняткі праводзяцца або ў школе, або пад спевы птушак у «зялёным класе» на свежым паветры. Інтэрактыўныя лекцыі чаргуюцца з практычнымі заняткамі, прадстаўленне ўласнага вопыту — з групавой распрацоўкай праектаў. Падчас трыццатага летніка кожны ўдзельнік распрацаваў з калегамі і прэзентаваў два праекты. Былі нават прэзентацыі ў выглядзе ўрока для дарослых, а гэта найвышэйшы пілатаж у рабоце з дарослай педагагічнай аудыторыяй.

Прычына трэцяя — лідар. Нязменным арганізатарам праекта застаецца **прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук Мікалай Іванавіч ЗАПРУДСКІ.** Менавіта яго аўтарскія курсы складаюць вучэбную аснову летніка ў апошнія два дзесяцігоддзі. Падчас трыццатага летніка альхоўская грамадскасць прысвоіла яму званне народнага дыдакта — педагога, які ўмее запальваць вочы настаўнікаў новымі ідэямі, ствараць цікавыя агульныя справы, адкрываць новыя гарызонты ў педагогіцы. Як сапраўдны лідар, ён вядзе за сабой, натхняе і падтрымлівае.

Прычына чацвёртая — стасункі падчас летніка. Тут збіраюцца настаўнікі, аб'яднаныя агульнай мэтай, са свежым крэатыўным мысленнем, гатовыя вучыцца і дзяліцца сваімі прафесійнымі знаходкамі. У Альхоўцы знаходзіш новых сяброў і з радасцю сустракаешся са старымі. Цяпло чалавечых сэрцаў, сапраўднае сяброўства і высокі прафесіяналізм ствараюць асаблівы настрой і энергетыку гэтага месца. Тут няма выпадковых людзей — сюды прыязджаюць асэнсавана...

Прычына пятая — актыўнае «пазакласнае» жыццё. Не вучобай адзінай жывы настаўнік. Кожны дзень у летніку праходзяць мерапрыемствы, якія рыхтуюць самі ўдзельнікі. Многія з іх за 30 гадоў сталі традыцыяй. Напрыклад, чароўнае Купалле з песнямі, карагодамі, скачкамі праз вогнішча і, вядома ж, пошукамі папараць-кветкі. Урачыстая «Акадэмія», падчас якой тых, хто працаваў у летніку дзесяць гадоў, прымаюць у Акадэмію альхоўскіх навук, а таксама віншуюць юбіляраў летніка, якія прыехалі сюды пяты, пятнаццаты, дваццаты і дваццаць пяты разы. Начное арыентаванне, калі каманды настаўнікаў ноччу шукаюць пікеты ў лесе і выконваюць жартоўныя заданні пікетчыкаў.

Кожны раз ураўвае сваім крэатывам канцэрт першагодак (так называюць тых педагогаў, якія прыехалі ў летнік упершыню). Нельга не згадаць і пра інтэлектуальна-спартыўную паласу перашкод, дзе трэба думаць, бегчы, страляць, рашаць, плаваць і... атрымліваць ад гэтага задавальненне. Ну і, вядома, пра абавязковую паходную лазню з купаннем у возеры Страча з бярозавымі і дубовымі венікамі.

Прычына шостая — мова, родная беларуская мова. Заняткі Мікалай Запрудскі праводзіць толькі на ёй. Беларускую мову можна чуць падчас пазакласных мерапрыемстваў, у зносінах паміж удзельнікамі, у песнях пад гітару каля вячэрняга вогнішча. Гэта не значыць, што нельга размаўляць па-руску. Кожны размаўляе на той мове, на якой яму больш зручна, але факт застаецца фактам — падчас летніка беларуская гучыць часцей! І гэта вельмі прыемна...

Прычына сёмая — прырода. Казачную прыгажосць паляны, акружанай соснамі, на беразе возера словамі перадаць немагчыма. Тут ёсць сям'я лебедзяў, якія кожны год прыплываюць, каб павітацца з педагогамі і пачаставацца. Чорныя рукі і вусны ад смачных чарніц, грыбны пах ад вогнішча, дзе булькае вячэра. Менавіта сярод такой прыгажосці раскінуўся палаткавы гарадок, дзе ёсць нават свае вуліцы: Рачная, Французскі бульвар, Шанхай. Чаму Французскі бульвар у беларускім лесе? Таму што яго «жыхары» калісьці прыязджалі ў летнік пераважна на французскіх марках аўтамашын.

Я згадала толькі сем прычын феномена метадычнага летніка для настаўнікаў, хоць насамрэч іх нашмат больш. Проста ў кожнага яны будуць свае: у таго, хто прыехаў упершыню, і ў таго, хто запаўняе свой аўтамабіль палаткамі, кнігамі, падарункамі для сяброў, вудамі ўжо ў дваццаты раз. Калі ты прыязджаеш на паляну, да цябе з усіх бакоў бягуць з абдымкамі і прывітаннямі старыя і новыя сябры. І ты ведаеш, што наперадзе цябе чакае незвычайны тыдзень. З намаганняў, старанняў і працы кожнага ўдзельніка будзе складацца чароўная атмасфера, якая дасць натхненне і зарад творчасці настаўнікам на будучы навучальны год. Таму не сумнявайцеся і прыязджайце на трыццаць першую Альхоўку. Абяцаю вам — не пашкадуеце!

Эла ЯКУБОЎСКАЯ,
настаўнік фізікі гімназіі № 1 г. Жодзіна, ганаровы член Акадэміі альхоўскіх навук.
Фота Святланы ЗДАРАНКОВАЙ.

WORLDSKILLS — НЕ СПОРТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Пераацаніць значэнне руху WorldSkills немагчыма. Гэта проста ідэальная пляцоўка для абмену ведамі, вопытам і найлепшымі практыкамі ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі кадраў, — разважае **начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.** — Спаборніцтвы праходзяць у такіх прафесійных сферах, як транспарт і лагістыка, будаўніцтва, тэхналогіі машынабудавання, інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, сфера паслуг, творчыя прафесіі і дызайн. Але спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб павысіць прэстыж рабочых прафесій сярод моладзі і спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў.

Заданні на міжнародных чэмпіянатах з'яўляюцца, па сутнасці, адлюстраваннем тых найноўшых тэхналогій, што ўкараняюцца ў рэальны сектар эканомікі і фарміруюцца экспертамі з усяго свету ў канкрэтнай кампетэнцыі. Увогуле, прафесійныя стандарты WorldSkills — гэта своеасаблівы выклік для нацыянальнай сістэмы прафесійнай адукацыі, паколькі патэнцыйныя інвестары ацэньваюць перш-наперш нашу краіну. Для таго каб выпускаць канкурэнтаздольную на знешніх рынках прадукцыю, патрабуюцца не толькі сучасныя тэхналогіі, але і спецыялісты самай высокай кваліфікацыі, якія змогуць працаваць на сучасным абсталяванні. А каб зразумець, наколькі кампетэнцыі, якімі валодаюць навучэнцы і выпускнікі нашых устаноў адукацыі, адпавядаюць сусветным стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў, мы павінны выкарыстоўваць міжнародныя індыкатары якасці.

— У Казані спаборніцтвы будуць праходзіць па 56 конкурсных кампетэнцыях. Таксама ўпершыню будзе прадстаўлены блок Future Skills — прафесіі будучыні: квантавыя тэхналогіі, тэхналогія інфармацыйнага мадэлявання будынкаў, тэхналогіі кампазітаў, 3D-прататыпаванне, інтэрнэт рэчаў, індустрыя 4.0, інжынерыя касмічных сістэм, віртуальная дапоўненая рэальнасць, рабатызаваная зварка, лічбавы мадэльер, лазерныя тэхналогіі, геномная інжынерыя, эксплуатацыя беспілотных авіяцыйных сістэм і іншыя, — расказвае **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Спаборніцтвы абяцаюць быць не толькі самымі маштабнымі, але і самымі цікавымі. Пройдзе і чэмпіянат юніёраў WorldSkills Juniors па 13 конкурсных кампетэнцыях, на які мы выстаўляем чатырох сваіх удзельнікаў.

Падчас чэмпіянату WorldSkills Belarus 2018.

Беларусь будуць прадстаўляць на 45-м чэмпіянаце WorldSkills International 36 канкурсантаў — усе яны былі пераможцамі ці прызёрамі чэмпіянату WorldSkills Belarus 2018. Іх падрыхтоўка да міжнародных спаборніцтваў вялася цэлы год. Яны стажыраваліся ў 18 краінах, прымалі ўдзел у рэгіянальных чэмпіянатах WSI, самыя буйныя з іх Worldskills Asia — Abu Dhabi 2018 і VI Адкрыты чэмпіянат «Маладыя прафесіяналы» ў Расіі.

А яшчэ ўсе члены нацыянальнай зборнай прайшлі пяцідзённы псіхалагічны трэнінг на стрэсаўстойлівасць і ўменне кіраваць сваімі эмоцыямі. Іх навучылі быць сапраўднай камандай!

На 44-м сусветным першынстве ў Абу-Дабі (ААЭ) два гады таму ўдзельнічалі больш як 1200 канкурсантаў з 59 краін. Беларусь заняла ў агульнакамандным рэйтынгу 16-е месца. Але поўнай нечаканасцю для многіх сталі новыя ўмовы для атрымання медаля выдатніка. (На англійскай мове назва ўзнагароды гучыць як Medal of Excellence — медаль дасканаласці, або перавагі.) У 2015 годзе на сусветным першынстве ў Бразіліі іх выдавалі ўдзельнікам чэмпіянату, якія набралі 500 і больш балаў, але не былі ўзнагароджаны залатым, сярэбраным ці бронзавым медалём. А ў Абу-Дабі неабходна было набраць у асабістым заліку ўжо 700 балаў. Большасць членаў беларускай каманды атрымалі больш як 650 балаў, прычым аднаму з іх да пераможнага медаля не хапіла ўсяго трох балаў. Медаль выдатніка ў намінацыі «цырульнае мастацтва» заваявала толькі выпускніца Брэсцкага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання Надзея Кашцялян.

У тым, што ў Казані беларусам не будзе проста, ніхто не сумняваецца. І планка для атрымання медаля выдатніка ўжо не апусціцца.

— У руху WorldSkills намецілася тэндэнцыя — зрабіць як мага большы аб'ём заданняў невядомым для канкурсантаў, — тлумачыць Валерый Галубоўскі. — Калі раней 70 % конкурснага задання раскрывалася загадзя, а 30 % захоўвалася ў «чорнай скрыні», то цяпер большасць экспертаў кажуць пра тое, што адкрытыя заданні дазваляюць прадстаўнікам некаторых краін (пераважна азіяцкіх, якія традыцыйна лідзіруюць у рэйтынгу WSI) за два гады натрэніраваць свае навыкі да аўтаматызму, каб паказаць максімальныя вынікі на спаборніцтвах. Але гэта не адлюстроўвае рэальны ўзровень падрыхтоўкі кадраў у краіне. І мы пры правядзенні нацыянальнага чэмпіянату разумеем, што чэмпіянат прафесійнага майстэрства — не спорт: там не вызначаюць, хто самы хуткі ці самы дужы. Галоўнае для нас — удасканаленне якасці прафесійнай адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях.

Надзея НІКАЛАЕВА.

...НА ШКОЛЬНЫМ БАЗАРЫ З КСЕНІЯЙ ГАЛЕЦКАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Заплечнік нам ужо не патрэбны, — звужае поле пошукаў Ірына. — Ксюшы яшчэ на Новы год Дзед Мароз падарыў вельмі добры, артапедычны і ўмяшчальны. Спецыяльна выбіралі не сумку, а заплечнік, у якім правільна размяркоўваецца нагрузка. І паколькі гэта быў ужо шосты клас, то звярталі ўвагу на аздабленне — без усякіх там кветачак ці сабачак...

— Пенал у мяне таксама ёсць, — дадае Ксюша. — Як выбірала? Галоўнае, каб туды ўмяшчаліся ручка, аловак, лінейка, ласцік і тачылка, каб нармальна адкрываўся і не займаў шмат месца ў заплечніку. Ну і звонку каб быў прыгожы, канешне. Так... Альбомы, каляровыя алоўкі, фарбы — гэта ўсё для вучобы ўжо не трэба, хоць дома, канешне, ёсць. Мой малодшы брацік часта ўсё гэта раскідвае, асабліва любіць сашчэпкі — рассыпае каробачку, і потым збіраем па ўсёй кватэры.

...У Галецкіх двое старэйшых дзяцей ужо выйшлі са школьнага ўзросту, таму Ірына — мама вопытная ў справе падбору вучнёўскай экіпіроўкі і кіруецца правілам «выбіраць не таннае, а якаснае». Успамінае: раней дачка часта ездзіла па чарнобыльскай лініі на аздараўленне ў Германію, і тамтэйшая сям'я дарыла на дзень нараджэння якасныя канцтавары. Некаторыя, як механічная тачылка, захаваліся і да сёння, а запасы пісьмовых і канцылярскіх прылад клапатлівая мама папаўняе на працягу ўсяго года па меры неабходнасці, скарыстоўваючы зніжкі і распродажы, таму школьны ажыятаж — гэта не пра сямейства Галецкіх.

— Каго больш складана сабраць у школу — хлопчыка ці дзяўчынку? — ставім пытанне рубам.

— Нейкай асаблівай розніцы я не адчула, — усміхаецца Ірына. — Адзенне і абутак мусяць добра сядзець і на хлопчыках, і на дзяўчатах, быць камфортнымі, не замінаць рухам. А вось пры выбары сшыткаў дзяўчаткі больш пераборлівыя: ім хочацца не аднатонныя, а прыгожыя, нават гламурныя, з бліскаўкамі ці чымсьці такім. Хлопчыкам, наадварот, чым прасцей, тым лепш. Што мы ў свой час выбіралі вельмі ўважліва, дык гэта нажніцы, — Ксюша ляўша, так што шукалі спецыяльныя. Але гэта, зразумела, рэч, якую адзін раз набыў і яна засталася надоўга. Пры выбары школьнага адзення звяртаю ўвагу на састаў: калі абутак — то абавязкова фабрычнай вытворчасці і скураны, у гэтым сэнсе мяне вельмі радуюць нашы беларускія вытворцы, тым больш у Ксюшы ўжо 36-ы памер, можна падабраць штосьці больш модная і ў дарослым аддзеле. Калі адзенне — то натуральнасць тканіны. Сінтэтыка можа быць, каб сукенка ці штаны менш зміналіся і даўжэй служылі, але пераважаць мусяць усё ж натуральныя валокны. Блузкі і кофтачкі выбіраем з Ксюшай такія, каб не апраналіся праз галаву, а зашпільваліся на кнопкі ці гузікі — так зручней пераадзявацца на фізкультуру, а яна ў нашай гімназіі калі не кожны дзень, то праз дзень.

Запасы пісьмовых і канцылярскіх прылад клапатлівая мама папаўняе на працягу ўсяго года па меры неабходнасці, скарыстоўваючы зніжкі і распродажы, таму школьны ажыятаж — гэта не пра сямейства Галецкіх.

Вывучаем доўгія шэрагі спадніц, кашуль і блузак. Першыя, як нам здаецца, прадстаўлены даволі аднастайна: чорныя альбо цёмна-сінія, хіба пара-тройка клятчастых мадэляў. А вось вешалкі з паўсядзённымі і святочнымі блузкамі выглядаюць больш прывабна.

— О, мама, глядзі, якая кашуля! — Ксюша прыкладвае да сябе ўпадабаную мадэль.

— Між іншым, цікава глядзіцца, калі толькі гэтыя дэкаратыўныя палоскі зносаўстойлівыя, — ацэньвае Ірына. — І састаў неблагі, і цана прымальная, тым больш калі прыйсці ў дні зніжак... Мне як маці больш даспадобы блузкі з карункамі па каўняры — на мой погляд, яны ўпрыгожваюць любую дзяўчынку, — а наверх, калі холадна, можна падабраць камізэльку ці кофтачку.

— Спадніцы мне падабаюцца досыць свабодныя, як зараз на мне, — дэманструе дзяўчынка. — Хоць у школу ў спадніцы я хаджу і нячаста, напэўна, толькі ў пачатку восені, потым «перабіраюся» ў штаны, бо дабірацца да школы далекавата, і зручную кофту. Таму і з калготкамі асабліва доўга не выбіраю — некалькі пар капронавых на восень, а пад штаны ўсё роўна, які там малюнак. На фізкультуру — дзве белыя майкі і спартыўныя штаны накшталт легінсаў.

У школьных сарафанах і сукенках, у адзін голас сцвярджаюць маці і дачка, на першым месцы зручнасць: «Старэйшай дачцэ ў свой час набылі прыгожы сарафан з засцежкай на спіне — і хоць у першым класе я ёй дапамагала з адзеннем, але самастойна малодшым школьнікам такую засцежку зашпільваць цяжка, цяпер таксама звяртаю на гэта ўвагу», — расказвае Ірына Галецкая.

— Сёння многія бацькі адчуваюць пэўную настальгію па савецкай школьнай форме...

— З пункту гледжання практычнасці і натуральнасці — так, мне падабалася форма, хоць шарсцяныя сукенкі і калоліся, але затое не зношваліся гадамі. У мяне, дарэчы, таксама захаваліся тыя карычневая сукенка і фартух — прыгожы, не «хэбэшны», а капронавы, яго набывалі ў Славакіі яшчэ ў час страшнага дэфіцыту, і я была вельмі модная дзяўчынка.

— А я звярнула ўвагу, калі праглядала старонкі ў «Інстаграме», што многія старшакласнікі і сёння выбіралі для выпускнога вечара савецкую школьную форму, — дадае Ксюша.

Пераходзім да паліц з канцылярскімі таварамі. «Так, ручкі трэба паспрабаваць, пажадана каб быў тонкі стрыжань і цёмнае чарніла, але ўрэшце галоўнае, каб якасна пісала», — разглядае без пяці хвілін сямікласніца прапанаваны асартымент. Уважліва перабірае і тоўстыя сшыткі, якіх трэба многа: Ксенія вывучае ажно чатыры замежныя мовы — англійскую, французскую, кітайскую і нямецкую плюс руская і беларуская, ды матэматыка, ды яшчэ сёлета пачнецца фізіка...

— У вашай гімназіі ёсць якія-небудзь патрабаванні да сшыткаў — напрыклад, каб былі толькі аднатонныя, без малюнкаў?

— Мы і самі ўжо, напэўна, «пераразлі» сшыткі з матылькамі і кветачкамі на вокладках. У школе, дзе я цяпер вучуся, ёсць такая завядзёнка — на ўвесь клас закупляем аднолькавага колеру сшыткі для кантрольных, а іншых абавязковых патрабаванняў няма. Сама стараюся падбіраць на кожны прадмет розныя, каб не блытаць — напрыклад, летась у мяне была цэлая калекцыя сшыткаў, афармленых у марскім стылі. Дарэчы, раней я вельмі любіла збіраць сшыткі, нават калі яны не былі патрэбныя. І, мабыць, на кожным школьным кірмашу мы з мамай куплялі што-небудзь новенькае і прыгожае — я магла іх нават не спісаць цалкам, проста складзі ў стосік, каб ляжалі і радавалі вока. Таксама ў мяне некалькі папак для замежных моў — там змяшчаюцца і раздрукоўкі з заданнямі, і рабочыя сшыткі.

Наогул, расказвае мама, Ксенія вельмі самастойная і адказная вучаніца. Яе не трэба будзіць і прыспешваць, дзяўчынка робіць усё самастойна і паспявае не толькі паспяхова вучыцца, але яшчэ займацца ў дзіцячай студыі Malinovka by Spamash, удзельнічаць у рэспубліканскіх і міжнародных вакальных конкурсах — і, натуральна, марыць звязаць жыццё з музыкай. «А яшчэ хацелася б вучыцца ў Оксфардзе, не дзеля прэстыжу, а таму, што ўзровень ведаў, якія там даюць, прызнаны ва ўсім свеце», — дзеліцца Ксюша на развітанне. І хто сказаў, што гэтыя планы нязбыўныя?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

АБНОВІМ ВУЧНЁЎСКІ ГАРДЭРОБ

Агульнагарадскі школьны кірмаш «Час ісці ў школу!» пройдзе 17—18 жніўня каля сталічнага Палаца спорту. А тыднем пазней, 23—24 жніўня, пашыраны продаж тавараў школьнага асартыменту будзе арганізаваны ў Палацы чыгуначнікаў на вуліцы Чкалава.

Усяго ў краіне разгарнулася больш за 500 школьных кірмашоў і пашыраных распродажаў да новага навучальнага года. Школьны асартымент тавараў рэалізуе каля шасці тысяч рознічных аб'ектаў гандлю. Шмат дзе практыкуецца папярэдні прыём заказаў на канкрэтныя мадэлі, адзенне падганяецца па фігуры дзіцяці. Напрыклад, такая паслуга будзе прадстаўляцца ў сталічным універмагу «Беларусь» з 1 да 31 жніўня, у ЦУМе — да 9 верасня.

На пастаяннай аснове гандлёвыя арганізацыі сумесна з вытворцамі і пастаўшчыкамі ладзяць акцыі і скідкі. Так, калекцыі мінулых гадоў можна купіць са скідкай да 50 %. Акрамя таго, прапануюцца розныя праграмы крэдытавання і растэрміноўкі — як за кошт уласных сродкаў, так і сумесна з банкамі. Праводзяцца акцыі сацыяльнай накіраванасці, якія прадугледжваюць скідкі шматдзетным сем'ям, дамам сямейнага тыпу, а таксама сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У гандлі прадстаўлена каля 500 мадэляў адзення дзелавога стылю для дзяўчынак і хлопчыкаў, каля 200 мадэляў абутку, больш за 70 мадэляў трыкатажных вырабаў, а таксама да 100 мадэляў ранцаў, заплечнікаў, торбачак са святлоадбіўнымі элементамі.

— Сёлета поўная экіпіроўка (сюды ўваходзяць адзенне, абутак, галантарэйныя тавары, школьныя пісьмовыя і канцылярскія прылады) для вучняў малодшых класаў можа каштаваць да 750 рублёў, а старэйшых — да 890 рублёў, — паведаміла журналістам **начальнік аддзела спажывецкага рынку Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.**

— Беларускія вытворцы абнавілі школьны асартымент прыблізна на 70 %, — сцвярджае **начальнік упраўлення ўнутранага гандлю і выставачнай дзейнасці канцэрна «Беллегпрам» Святлана КАХРО.** — З 360 мадэляў адзення, прапанаваных у гэтым сезоне, 300 — новыя. Астатнія 60 — тыя, што карысталіся раней найбольшым попытам. Істотна абнавіўся і абутковы асартымент. З 356 мадэляў — 226 навінак. Прычым дызайнеры вельмі пастараліся: у вырабах з'явілася новая фурнітура ў выглядзе тасьмы, стужак з надпісамі і г. д. — тое, што любяць дзеці і падлеткі. Для адзення таксама выкарыстоўваліся новыя віды тканін: віскоза, шыфон, гіпюр і іншыя. Што датычыцца адпускных цэн, то яны сёлета засталіся практычна на ўзроўні 2018-га. Толькі трохі павысіліся цэны на абутак — прыблізна на 7 %.

На пачатак жніўня ў гандлёвую сетку сталіцы ўжо пастаўлена больш за 90 % запланаваных аб'ёмаў адзення для школьнікаў, больш за 70 % абутку і амаль 100 % галантарэйных тавараў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ДВУХ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ВЕЛИКОЛУКСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ БАРАНОВИЧСКОГО РАЙОНА

№ п/п	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика инженерных коммуникаций	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Площадь земельного участка, га	Назначение участка	Начальная цена объекта (BYN)	Сумма задатка (BYN)	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (BYN)
1	Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский сельисполком, дер. Яново, ул. Пригородная, 11 кадастровый номер 120480405601000101	Участок свободен от застройки	Газопровод, линия электропередач, водопровод, дорога грунтовая	0,1500	Для обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	6166,88	616,68	1752,00, кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона

1. **Дата, время и место проведения аукциона:** 17 сентября 2019 года в 15.00 в здании Великолукского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Великолукский сельисполком, агрогородок Русино, ул. Школьная, 25.
2. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.
3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10 %.
4. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:
- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка (10 % от начальной цены);
- копию документа, удостоверяющих личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов, на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
5. Сумма задатка перечисляется до 11 сентября 2019 г. включительно до 16.45 на расчетный счет BY 91 AKBB 3641 0022 7005 9130 0000 BYN, код платежа – 4901, фил. 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21802, УНП 200046979. Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а. Получатель: Великолукский сельский исполнительный комитет, 225350, Брестская область, Барановичский район, аг. Русино, ул. Школьная, 25.
6. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего земельного участка. Если два и более участника аукциона согласились с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласился со следующей объявленной им ценой, аукционист предлагает участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона. После объявления участником аукциона своей цены аукционист называет аукционный номер этого участника и предложенную им цену. При этом предложенная участником аукциона цена, равная цене, предложенной другим участником аукциона, не принимается. Участники аукциона объявляют свою цену до тех пор, пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему земельному участку. Если после предложения аукциониста только один из участников объявит свою цену, аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему земельному участку. Если ни один из участников аукциона не предложил свою цену, аукцион в отношении соответствующего земельного участка признается несостоявшимся.
7. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи:
каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел.: (8 0163) 620879; 620878.
8. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в протоколе аукциона и решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.
9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.
10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 16 августа 2019 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14 до 17.00 (каб. № 3 сельисполкома). Последний день приема документов – 11 сентября 2019 года до 16.45. Заключительная регистрация участников аукциона – 17 сентября 2019 г. с 14.35 до 14.55. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.
11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:
подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;
в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион;
осуществить в двухмесячный срок государственную регистрацию права собственности на земельный участок, получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома;
занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него.
12. Победителю аукциона необходимо будет произвести возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной инфраструктуры к земельному участку, водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение, транспортную инфраструктуру путем единовременного перечисления средств в доход бюджета в течение срока строительства дома, установленного в проектной документации с учетом индексации.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY
Продавец: КУП по оказанию услуг «Жабинковский районный комбинат бытового обслуживания» (УНП 200038357) 225101, Брестская обл., г. Жабинка, ул. Федяя, 9, тел./факс 2-16-67, в лице ликвидатора ИП Лукша Юрия Николаевича.
Публичные торги в электронной форме будут проведены: 22 августа 2019 г. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	Изолированное помещение с инв. №141/D-6410 (назначение – помещение бытового обслуживания населения), расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ракитницкий с/с, аг. Ракитница, ул. 24 съезда КПСС, 5-2, площадью – 94,00, право постоянного пользования на земельный участок с кадастровым номером122582403102000001, площадью 0,7270 га, 3/50 доля в праве. Обременение – объект находится в аренде	13 280,00
2	Машина стирально-отжимная ЛО-10, инв. 1951	2 359,00
3	Машина стирально-отжимная ЛО7-02, инв. 1952	1 127,00
4	Машина стирально-отжимная ВО-20, инв. 2111	2 492,00
5	Машина стирально-отжимная ВО-15, инв. 2122	3 199,00
6	Машина стирально-отжимная FX105, инв. 2120	6 573,00
7	Машина стирально-отжимная WED-13, инв. 1981	4 396,00
8	Машина стирально-отжимная WED-18, инв. 1982	1 022,00
9	Машина стирально-отжимная LGF1281TD, инв. 2118	280,00
10	Машина сушильная ЛС-10, инв. 1953	1 449,00
11	Машина сушильная ЛС-10, инв. 1954	1 449,00
12	Машина сушильная TD2005/10E, инв. 1980	2 730,00
13	Машина сушильная ВС25, инв 2116	2 856,00
14	Гладильный каток «Белуша» KZ162, инв. 11719	364,00
15	Гладильный каток «Текстима», инв. 1937	497,00
16	Гладильный каток ЛГ-16, инв. 1954	1 778,00
17	Каландр гладильный ЛК-1840, инв. 2121	5 362,00
Местонахождение: Брестская обл., г. Жабинка, ул. Федяя, 9, тел. для ознакомления и осмотра +375 29 271-41-18 – Анатолий		

Для участия в торгах необходимо в срок по 21.08.2019 г., 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5%, задаток – 10% от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 9 сентября 2019 г. открытого аукциона по продаже не завершенных строительством жилых домов и земельных участков, необходимых для обслуживания не завершенных строительством жилых домов в частную собственность в Чернавчицком сельском Совете Брестского района

№ лота	Предмет аукциона	Местоположение объекта	Начальная цена предмета аукциона, (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона (бел. руб.)
1	Не завершенный строительством не законсервированный жилой дом в виде капитального строения наружной площадью 167 кв. м, готовностью основного строения 10 %. Составные части и принадлежности: гараж – готовность строения 19 % и земельный участок с кадастровым номером 121284600601000129 площадью 0,1566 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	д. Блювиничи, ул. Топольная, 7А	15000, в том числе: 10888,07 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома 3904,07 – начальная цена земельного участка 207,86 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома	1500	1. 453,57 – затраты на регистрацию участка и объявления. 2. Плата за объявления по актам выполненных работ
2	Не завершенный строительством не законсервированный жилой дом в виде капитального строения наружной площадью 129 кв. м и земельный участок с кадастровым номером 121284604101000225 площадью 0,1301 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	д. Козловичи, ул. Юбилейная, 5	15000, в том числе: 6897,40 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома 7902,72 – начальная цена земельного участка 199,88 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома	1500	1. 73,5 – затраты на регистрацию участка. 2. Плата за объявления по актам выполненных работ
3	Не завершенный строительством не законсервированный жилой дом в виде капитального строения наружной площадью 121 кв. м готовностью основного строения 7 % и земельный участок с кадастровым номером 121284604601000078 площадью 0,1535 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	д. Малая Курница, ул. Солнечная, 4	11000, в том числе: 2300,02 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома 8494,13 – начальная цена земельного участка 205,85 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома	1100	1. 73,5 – затраты на регистрацию участка. 2. Плата за объявления по актам выполненных работ

Аукцион будет проводиться 09.09.2019 в 15.00 по адресу: Брестский район, аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома).
Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернавчицкого сельского исполнительного комитета № BY12AKBB36410000002201000000 в филиале 100 БОУ «Беларусбанк», г. Брест, БИК AKBBBY21100, УНП 200036594, код платежа – 4901, задаток в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, документ (паспорт) подтверждающий личность покупателя.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
Председатель комиссии по организации и проведению аукциона обеспечивает осмотр предмета аукциона претендентом на участие в аукционе в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.
Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников в отношении предмета аукциона.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 3 сентября 2019 года до 17.00.
Контактные телефоны: 94 51 35, 94 51 36.

ОАО «Гомельоблреклама» (продавец) извещает о проведении 20 августа 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 80 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-42584, общей площадью 1 616,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административный корпус.** Составные части и принадлежности: **галерея**. Забор железобетонный **36,0 м. п** (инв. № 114), вертикальные планировки и благоустройство (инв. № 12), в т. ч.: проезжая часть **632,0 кв. м**, борты **42,0 м. п**; озеленение 7 деревьев (инв. № 13); распредустройство – 3 шт. (инв. № 32). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006004802 площадью 0,1849 га** – для эксплуатации и обслуживания административного здания (право аренды). **Местонахождение:** Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7	70 980,00	3 549,00

Продавец: ОАО «Гомельоблреклама», г. Гомель, ул. Гагарина, 20. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8(0232) 23-23-53 – Ирина Борисовна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Гомельоблреклама** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **10 августа 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 19 августа 2019 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества**. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029)126-66-62.**

ОАО «Пинский винодельческий завод» сообщает о проведении 26.08.2019 г. вторых повторных электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества: 1. Здание магазина № 2, г. Брест, ул. Шоссейная, 9 – 302 680,00 бел. руб.; 2. Магазин № 35, Витебская обл., Оршанский р-н, аг. Межево, ул. Центральная, 62 – 205 344,00 бел. руб.; 3. Административное здание, Витебская обл., г. Миоры, ул. Комсомольская, 63 – 47 858,40 бел. руб.; 4. Торговое помещение магазина «Торговый центр», Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Ленина, 50а, пом. 1 – 82 386,00 бел. руб.; 5. Здание, Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Подольская, 18А – 149 040,00 бел. руб. Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.

УНП 200110728

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Апавяданне «Дзве зоркі» наскрозь пранізана элегічным настроем лірычнага героя, і калі б яно мела падзагаловак «элегія» — бадай, гэта было б цалкам апраўдана. Канешне, прынята лічыць, што элегія жанр вершаваны, аднак жа і ў прапанаваным на звяздоўскі конкурс «настальгічным маналогу» Дзмітрыя Пятровіча шмат якія фразы і нават цэлыя абзацы напісаны на мяжы двух відаў мастацтва — паэзіі і прозы.

Алесь БАДАК.

Дзмітрый ПЯТРОВІЧ

Настальгічны маналог

ДЗВЕ ЗОРКІ

Я добра запомніў той дзень... Ішоў першы снег. На чорным халодным асфальце сняжынкі здаваліся бялюткімі матылькамі. Самыя спрытныя з іх кружыліся каля ліхтароў, утвараючы адчайна-смелыя белыя клубкі, што варушыліся ў паветры, падсвечаныя вячэрнімі сонцамі-лямпамі. Менш удачлівыя з іх лёталі перад фарамі машын, спадзеючыся хоць бы ў апошні момант зліцца з псеўдасонечнымі промнямі, растапіўшы свае халодныя сэрцы... Большасць з іх, крануўшыся доўгачаканай зямлі, адразу зліваліся з ёй, растаўшы ў цёпла-марозным паветры і развітаўшыся з надзеямі знайсці хоць калі-небудзь сваё непаўторна-прывіднае шчасце — шчасце вечнага жыцця...

На трамвайным прыпынку было шмат народу. Адны прыкрываліся ад першаснежнага дэсанту парасонамі. Другія, не звяртаючы ўвагі на сняжынкі, нават не адварочваліся ад пранізліва-калючага ветру, які налятаў парывамі, з перапынкамі: напэўна, яны першымі ўбачылі трамвай. Расквечаны агнямі, ён быў сапраўдным прытулкам ад непагадзі — як аазіс сярод снежнакрылых матылькоў, кожны з якіх імкнуўся знайсці штосьці сваё тут, на чорнай непрыветнай зямлі...

І раптам... Вельмі прыемна было ўбачыць знаёмы твар, калі здавалася, што нішто ўжо не сагрэе азяблую душу. І не толькі ад марозу і сіверу... У першы момант падумалася: «Няўжо яна?» Але паверыць было вельмі цяжка: снег не толькі не даваў разгарнуцца напоўніцу маёй фантазіі, а, наадварот, прымушаў сагнаць думкі толькі сузіранням «феерычнай» у прамым і пераносным сэнсе падсветкі дамоў і помнікаў на плошчы Якуба Коласа... Дзяўчына ў чорным паліто нарэшце зірнула ў мой бок — і я пазнаў яе... Так, гэта была яна, Ангеліна — дачка прафесара Шаўцова...

* * *

— Так, дзяўчаты... і хлопцы... — прафесар Шаўцоў, заўважыўшы сярод першакурснікаў нас, прадстаўнікоў моцнага полу (трох чалавек з сямі), якія прысутнічалі на першай лекцыі, што пачыналася а восьмай гадзіне раніцы (астатнія нашы «героі» яшчэ ніяк не маглі прачнуцца), пра нешта расказваў з невялікай кафедры. Але слова «студэнт» сапраўды аб'ядноўвала ўсіх — нават тых, хто рашуча не жадаў вучыцца, бо было так рана — восем гадзін...

Позняя восень. Дзяўчаты і нават некаторыя хлопцы сядзелі на лекцыі ў куртках ці паліто: аўдыторыя вялікая, вельмі холадна, а нас, «спецыялістаў» па анатоміі — менавіта гэтую дысцыпліну і выкладаў прафесар Шаўцоў — усяго некалькі дзясяткаў (хоць павінна быць намнога больш).

Невялікага росту, хударлявы, ён не рабіў уражання ўпэўненага ў сабе чалавека — хутчэй, наадварот. Пакуль не пачынаў гаварыць. З такой любоўю да свайго прадмета, з такім замілаванням... Адчувалася, што перад намі сапраўдны ас сваёй справы. Але, на жаль, амаль усе дзяўчаты ўспрымалі словы нашага настаўніка вельмі несур'ёзна (калі не сказаць горш): размаўлялі адна з адной, пісалі нешта на кавалачках паперы, і потым з загадкавым выглядам якая-небудзь з прыгажунь перакідвала на наш, хлопцаў, стол гэтыя «пісьмёны». І амаль адразу на ўсю аўдыторыю гучаў ужо не дзіцячы, з «падбаскам», смех.

Прафесар Шаўцоў ускідваў галаву і, прыжмурваючы вочы пад маленькімі акулярамі, імкнуўся адразу папярэдзіць усіх «узбуджальнікаў спакою»:

— Паважаныя калегі, — ён усіх нас заўсёды называў «калегамі» (калі б разумелі мы тады, з якой павагай ён да нас ставіўся — сапраўдны інтэлігент!). — Хачу вам нагадаць, што тыя з вас, хто прынясе мне ўсе канспекты маіх лекцый, атрымае «аўтамат»...

Я ўважліва аглядаў сваіх таварышаў, але ніхто з іх, здавалася, не імкнуўся атрымаць той самы «аўтамат»: амаль кожны, за вялікім ключэннем, займаўся сваёй справай...

...Напрыканцы семестра, нарэшце, прафесар прыняў залік. І якое было яго здзіўленне, калі я паклаў на стол разам з залікоўкай некалькі сшыткаў. Гэта былі канспекты ўсіх лекцый (у адрозненне ад маіх сяброў, я не марнаваў час).

— Вы вельмі прыемна здзівілі мяне, — здавалася, прафесар Шаўцоў чамусьці знаходзіў апраўданне таму, што далёка не ўсе з нас выканалі яго патрабаванні. — Жадаю вам стаць сапраўдным спецыялістам...

Скажу шчыра, я захаваў пажаданне гэтага паважанага чалавека ў памяці на ўсё жыццё...

* * *

...Заснежаны Дом настаўніка на вуліцы Энгельса: хутка Новы год. Мой малодшы сын разам з жонкай у нядзельнай школе. Налета — першы клас. Але зрок у хлопца «плюсавы». І як заўсёды бываў ў жаночым «асяроддзі», падтрымка хутка знайшлася. У нядзельнай школе нашы сыны сядзелі побач.

— Вы ведаеце, я пагавару з матуляй, і вы прыходзьце да яе — тут недалёка, у 3-й бальніцы яна працуе. Скажаце, што ад мяне — і вас прымуць. Толькі вось чэргі...

Незнаёмка з цёмна-каштанавымі валасамі «карэ» падышла да маёй жонкі і прапанавала агучанае вышэй. Назвалася проста: «Ангеліна». Яна трымала за руку сына, як потым высветлілася, равеснік майго Сяргея. Жонка была вельмі здзіўлена, пачуўшы такую прапанову. Яна проста не ведала, якія адкрыцці чакалі нас неўзабаве... А чэргі... Ці можна было здзівіць гэтым чалавека той, савецкай, загартоўкі?

* * *

Я падзяліў гэты калідор на тры аддзяленні. У першым сядзелі людзі, што яшчэ, безумоўна, не ведалі, якія выпрабаванні чакаюць іх далей, і таму размаўлялі адно з адным амаль бесклапотна і нават весела (проста гэтыя чакалі сваёй чаргі менш чым адну гадзіну). Другія былі больш сур'ёзныя (гэта быў іншы «кавалак» калідора), ужо амаль не размаўлялі між сабою (тыя чакалі ўжо гадзіны паўтары). А вось трэція знаходзіліся ў своеасаблівым «прылазніку» каля кабінета (яны былі ў прадчуванні сустрэчы з урачом). Большасць наведвальнікаў была з дзецьмі, таму можна зразумець усё тое, што адбывалася ў калідоры афтальмалагічнага аддзялення бальніцы № 3 імя легендарнага прафесара Клумава.

Пасля дзвюх гадзін чакання мы з Сяргеем (жонка далучылася да нас трохі пазней) пачалі чытаць «лозунгі — плакаты» на сценах калідора. Вядома ж, чытаў я, а мой Сяргей пальчыкам паціху-патроху падкалупваў сухую фарбу на сцяне (напэўна, нанесеную ў свой час паўторна), якая, на яго радасць, дастаткова лёгка падавалася. Я, шчыра кажучы, амаль адразу, заўважыўшы цікавасць сына да такога віду «мастацтва», перарваў яго намаганні, і дастаткова хутка (калі не лічыць дзвюх гадзін) мы трапілі ў кабінет, на дзвярах якога заўважыў прозвішча нашага ўрача — «Прафесар Шаўцова». Тады, заклапочаны здароўем сына і загартаваны ў «савецкай» чарзе, я, шчыра кажучы, не звярнуў увагі на гэтае прозвішча. Прыгожая, чорнавалосая, з лёгкай сівізной, абаяльная жанчына прыняла нас, яшчэ не ведаючы, што мы ад яе дачкі (тады, у савецкі час, амаль усё так і рабілася — па знаёмстве; а ці змянілася што-небудзь цяпер?..). А калі даведалася, што добра знаёмыя з яе Ангелінай і нашы дзеці вучацца разам... Мы былі прыемна ўражаны такім прыёмам...

Сапраўднае адкрыццё я зрабіў літаральна праз некалькі дзён пасля таго, як прафесар Шаўцова прызначыла нам курс лячэння. Седзячы на калідоры ў чаканні прыёму, я раптам заўважыў, што міма нас прабег — па-іншаму не магу сказаць — мой знаёмы прафесар Шаўцоў. І накіраваўся якраз у той кабінет, дзе вяла прыём наша знаёмая — прафесар Шаўцова...

І чаму я раней не мог нават падумаць пра гэта? Такое супадзенне! Гэта зараз, калі ўжо ёсць мабільныя тэлефоны, я магу набраць нумар знаёмага і ўдакладніць любую інфармацыю. А тады... Я быў чамусьці настолькі здзіўлены, што «апрытомнеў» толькі тады, калі пераступіў парог нашай кватэры.

— Скажы, калі ласка, а як прозвішча нашай новай знаёмай Ангеліны? Сын яе вучыцца разам з нашым у нядзельнай школе... — спытаў я ў жонкі, адчуваючы сябе як мінімум Эркюлем Пуаро, і дадаў: — Ты ж калісьці гаварыла, што яна не замужам.

— Шаўцова, — адказала яна.

Пачуўшы гэта, я нарэшце пераканаўся ў тым, што прафесар Шаўцоў каля кабінета ў бальніцы імя Клумава — гэта, і сапраўды, мой выкладчык анатоміі ва ўніверсітэце, Ангеліна — яго (дакладней кажучы, іх, прафесараў Шаўцовых) дачка. І яны, гэтыя ўжо пажылыя людзі, так моцна кахалі адно аднаго, што нават не маглі пражыць у расстанні ніводнага дня. Так потым расказвала нам Ангеліна...

* * *

Наступная восень мне больш не падалася такой радаснай на адкрыцці...

Прыйшоўшы аднойчы з заняткаў, я ўбачыў жонку ў слязах. Тое, што яна паведаміла, ашаламіла: «жыгулёнак» Шаўцовых, на якім яны, як заўсёды, вярталіся з дачы, каля кальцавой сутыкнуўся з грузавіком. Гэтыя два ўлюбёныя ў жыццё чалавекі, амаль незнаёмыя мне (і адначасова такія родныя!), загінулі адразу... Абое. Жылі разам і загінулі ў адзін дзень. У адно імгненне...

Так скончылася іх зямная казка: усё жыццё кахалі адно аднаго і памерлі разам у адзін дзень... Але яны жывуць, як дзве нязгасныя зоркі, — у нашай памяці...

* * *

Трамвай, нарэшце, падышоў, і людзі, што былі на прыпынку, расталі ў гэтым аазісе цяпла і святла... Я азірнуўся: Ангеліны на вуліцы ўжо не было...

Сняжынкі, як і раней, мітусіліся ў паветры — іх жыццё доўжылася нейкія імгненні. Напэўна, як і наша, — гэта таксама нейкая секунда яе спадарыні Вечнасці. Але ж так хочацца пражыць свае імгненні-хвіліны не проста так — пакінуць хоць нейкі след у памяці-матрыцы вечнага Сусвету...

Замор'е

Хто больш за ўсіх падарожнічае

Нацыяй, якая больш за іншыя падарожнічае па свеце, сталі жыхары Злучанага Каралеўства. Пра гэта гаворыцца ў справаздачы Міжнароднай асацыяцыі паветранага транспарту (IATA).

Паводле звестак асацыяцыі, каля 126 мільёнаў грамадзян Вялікабрытаніі (8,6 % усіх пасажыраў у свеце) накіроўваліся ў замежныя паездкі самалётам. На другім месцы апынуліся амерыканцы — прыкладна 115 мільёнаў жыхароў ЗША (7,6 % усіх пасажыраў) падарожнічалі па паветры ў 2018 годзе. Трэцюю пазіцыю занялі кітайцы (97 мільёнаў падарожнікаў, 6,6 %), чацвёртую — немцы (94 мільёны падарожнікаў, 6,4 %), пятую — французы (каля 60 мільёнаў падарожнікаў, 4,1 %).

«Жонка шэйха» скрала ўпрыгажэнні

Невядомая жанчына скрала ўпрыгажэнні з парыжскай ювелірнай крамы, прыкінуўшыся жонкай дубайскага правіцеля, паведамляе lenta.ru.

У адну з люксавых ювелірных крам у Парыжы зайшлі дзве жанчыны. Адна з іх назвалася жонкай дубайскага шэйха, іншая была прадстаўлена як яе памочніца. Паводле слоў прадаўца, пакуль яны выбіралі ўпрыгажэнні, у буцік неаднаразова тэлефанавалі. У канцы жанчына выбрала каштоўнасці, склала іх у скрыню і папабяцала перавесці краме грошы за іх на наступны дзень. Пасля гэтага пасылку павінны былі адправіць на паказаны адрас. Аднак у абяцаны тэрмін грошы не прыйшлі, а супрацоўнікі знайшлі ў скрынцы замест упрыгажэнняў булённыя кубікі. Агульная сума выкрадзеных ювелірных вырабаў складае каля 1,3 мільёна еўра.

Не паверыў унучцы — і выйграў

Жыхар амерыканскага штата Арэгон ледзь не страціў буйны выйгрыш у латарэю праз няўважлівасць унучкі, паведамляе партал UPI.

94-гадовы Уільям Боўкер згадвае, як да яго ў госці зазірнула ўнучка і прапанавала праверыць яго латарэйны білет. «Яна вырашыла, што я ўдзельнічаў у розыгрышы Mega Million, і пачала абводзіць нумары, якія супадалі з іх выйгрышнай камбінацыяй, — тлумачыць амерыканец. — Але я купіў білет Game Megabucks. Пасля таго як яна скончыла, я вырашыў пераправерыць за ёй, і дзякуй богу. Я сарваў куш!» Боўкера здзівіла, што ў Game Megabucks была адна прызавая камбінацыя, у той час як яго ўнучка адзначыла на білеце зусім іншыя лічбы. Недаверлівасць прынесла амерыканцу 6,5 мільёна долараў. Пераможца вырашыў падзяліць выйграныя грошы паміж членамі сваёй сям'і, сказаўшы, што асабіста ў яго ўсё ёсць.

Іван КУПАРВАС.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 29 (471)

«Я павінен помніць пра норму па запаўняльнасці залы...»

Аляксандр ХУМАЛА:

Пакуль у сталічным Верхнім горадзе гучаць суботнія «класічныя» канцэрты, мы запрасілі на сустрэчу галоўнага дырыжора капэлы «Санорус» Аляксандра Хумалу. З адным з самых прадстаўнічых маладых беларускіх музыкантаў, за плячыма (і на плячах) якога ў тым ліку Ротэрдамская кансерваторыя і надзвычайны міжнародны досвед, мы пагаварылі пра сферу акадэмічнай музыкі ў Беларусі і ўспрыманне класікі публікай.

— У мінулую суботу капэла «Санорус» выступіла на фестывалі «Класіка ля Ратушы», дзе найлепшыя калектывы даюць канцэрты пад адкрытым небам, а публіка можа бясплатна паслухаць акадэмічную музыку. Вядома, такі папулярны фармат здольны павялічыць колькасць прыхільнікаў класікі і ўпрыгожыць гарадское жыццё, але ці не абясцэньвае ён ва ўсведамленні людзей акадэмічную, «элітную», музыку?

— Open air канцэрты класічнай музыкі папулярныя ва ўсім свеце, у першую чаргу ў ЗША, дзе ў вялікіх і маленькіх гарадах кожны ўік-энд арганізуюцца пікнікі з аркестрамі — у асноўным духавымі, часам сімфанічнымі, гэта могуць быць і проста рэчыталы. Такі фармат заявіў пра сябе даўно, але для Беларусі застаецца ноу-хау: у нашых гарадах пакуль рэдка пачуеш жывую музыку, што, вядома, уплывае на іх успрыманне. Не згаджуся, што падобныя івэнты могуць прыцягнуць да класікі, мне падаецца, з тых, хто пачуе музыку на вуліцы, свядома ў канцэртную залу пойдзе толькі пара чалавек і тое на ўзроўні арыфметычнай хібнасці. Такія канцэрты для людзей — перш за ўсё прыемнае баўленне часу, што нядрэнна, бо можна не проста прагуляцца, але і атрымаць ад прагулкі карысць. Калі ў цягніку ці ў самалёце адкрыць кнігу Дастаеўскага, час у дарозе не пройдзе дарэмна, прычым гэта не абясцэніць пісьменніка. Класічная музыка таксама не абясцэніцца праз open air канцэрт: яна ўвогуле самадастатковая і не мае патрэбы ў тым, каб завабліваць людзей. Завабліваць мусіць эстрадная, поп- і рок-музыка, а сапраўдныя рэчы — не. Сапраўдная кніга не «крычыць»: «Вазьмі мяне і прачытай» — вы самі дацягваецеся, адкрываеце і пачынаеце чытаць, напрыклад «Вайну і мір».

— То-бок паняцце «індустрыя» і класічная музыка несумяшчальныя?

— Ва ўсім свеце акадэмічная музыка, як і любая іншая, з'яўляецца часткай шоу-бізнесу: людзі ўкладваюць сродкі ў яе развіццё і зарабляюць на гэтым. Але калі гаварыць пра структурнае стаўленне да музыкі — яна не мае патрэбы ў прасоўванні. Творы Баха, адны з найлепшых і найцікавейшых у свеце, пасля яго смерці не выконваліся сто гадоў — пра іх проста забылі і ў рэшце рэшт знайшлі ў кутах старых бібліятэк.

— А ў Беларусі паняцце «індустрыя» мае нейкае дачыненне да сферы класічнай музыкі?

— Хоць у пытаннях беларускага рынку я выступаю хутчэй у якасці прафана, магу сказаць, што ён знаходзіцца на зародкавым узроўні — гэта датычыцца і класікі, і папулярнай музыкі. Мне незразумела, як мы збіраемся канкурыраваць з усім светам, калі не вытрымліваем параўнання нават з Украінай і Расіяй. Папулярная музыка лягчэйшая для ўспрымання, гэта музыка фаст-фуду, яе не трэба «гатаваць» і «пераварваць», таму лягчэй узяць у абарот і атрымаць фінансавую аддачу. Але ж мы ходзім у добрыя рэстараны, дзе спецыяльна для нас добры повар гатуе добрую ежу, таму хоць з акадэмічнай музыкай і складаней, на ёй ва ўсім свеце таксама робяць грошы. Наша праблема ў тым, што ў краіне амаль адсутнічаюць менеджары культуры, а тыя нешматлікія, хто займаецца музыкай, часта прасоўваюць не культуру, а сябе, таму апроч ролі менеджара выступаюць у якасці экспертаў, хоць ніякага ўяўлення пра музыку могуць і не мець.

— Шмат класікі ў нашым жыцці застаецца на фоне — у рэкламе, рынгтонах, як ненавязлівае суправаджэнне на рознага кшталту мерапрыемствах. Вам не здаецца, што на фоне яе больш, чым у свядомым спажыванні?

— Я параўноўваю гэта з «разумнымі» цытатамі з літаратурных твораў у сацсетках — вытрымкамі з Чэхава альбо Антуана дэ Сент-Экзюперы накшталт «Мы ў адказе за тых, каго прыручылі». Гэтыя цытаты вырваныя з кантэксту, у наш час лягчэй прачытаць адну фразу і пабегчы па справах, бо каб яе знайсці, трэба адолець цэлую кнігу. Класічная музыка на фоне гучыць як цытата і нічога агульнага з поўным творам не мае. Выказванне вядомага пісьменніка, магчыма, і застанецца ў галаве на найбліжэйшую гадзіну, але хутка вылеціць, вы яго забудзеце, для вашага жыцця яно не прынясе ніякай карысці. Тое ж самае з класічнай музыкай: рынгтон сальецца з шумам натоўпу, а дзякуючы сімфоніі вы перажывяце цэлую гісторыю.

— У нас не так шмат месцаў, дзе выконваецца класіка: адна філармонія, два музычныя тэатры, некалькі фестываляў і асобныя ініцыятывы. Капэла «Санорус» неяк іграла «Месячнага П'еро» Шонберга, што ў нашай краіне гучала ўпершыню. Наколькі поўна тое, што выконваецца ў Беларусі, адлюстроўвае пласт акадэмічнай музыкі?

— Прафесійныя калектывы кіруюцца не толькі тым, што хочацца іграць: краеугольным каменем з'яўляецца фінансавае пытанне, то-бок разлік на тых, хто набудзе білеты. «Месячны П'еро» — архіскладаны твор, я думаў, што выступленне будзе правальным, але на яго прыйшло столькі людзей, што мы арганізавалі другое і зноў адыгралі перад поўнай залай. Тут трэба мець смеласць і рызыкаваць, а, напрыклад, у Маскве, дзе я шмат працую, з рызыкай ніхто не звязваецца: арганізатары павінны быць упэўненыя ў тым, што публіка прыйдзе на канцэрт, таму кіруюцца звычайным рэпертуарам і запрашаюць зорак. Сучасная акадэмічная музыка ў Маскве таксама іграецца, але ў большасці выпадкаў — чарговы раз Чайкоўскі, чарговы раз Вердзі, чарговы раз Брамс. У нас іграюць класічны рэпертуар, нашмат радзей беларускую акадэмічную музыку і яшчэ радзей сучасную акадэмічную музыку, хоць сучасная яна толькі ўмоўна, бо створанае 10—20 гадоў таму новым больш не з'яўляецца. Праблемай мне падаецца і тое, што некаторых аўтараў, якія маюць дачыненне да Беларусі, мы баімся іграць і прасоўваць як сваіх. Папулярнай зараз стала музыка Маісея Вайнберга, які лічыцца польскім і расійскім кампазітарам, але ніхто не ўспамінае, што прафесійныя асновы ён атрымаў у Беларусі, калі тры гады вучыўся ў роданачальніка нашай кампазітарскай школы Васіля Залатарова. Мы не ўспамінаем, што ў Шастаковіча ёсць беларускія карані, і баімся сказаць, што Манюшка — беларускі кампазітар. Дык вось калі я хачу сыграць «сучаснага» кампазітара накшталт Шонберга, я павінен помніць пра норму па запаўняльнасці залы і быць упэўнены, што 75 працэнтаў білетаў будзе раскуплена, а я ў гэтым не ўпэўнены.

— Капэла «Санорус» — дзяржаўная ўстанова, а ці магчымыя ў нас іншыя формы існавання для музычнага калектыву такога маштабу?

— Магчымыя, але па антрэпрэнёрскай сістэме, калі музыканты аб'ядноўваюцца вакол пэўнага праекта. Гэта вядомы фармат, і ён у нас выкарыстоўваецца. «Санорус» — пастаянны калектыў з пастаянным «месцам жыхарства», рэпетыцыямі кожны дзень, канцэртна-гастрольным планам, планам па запаўняльнасці залы і дзяржаўным фінансаваннем.

— Шмат беларускіх музыкантаў з'язджаюць самарэалізоўвацца за мяжу, і многія з іх сапраўды дасягаюць поспеху. Вы ж маеце шырокую карту выступленняў, але застаяцеся ў Беларусі. Раскажыце, на якія перспектывы ў нашай краіне могуць разлічваць маладыя музыканты?

— Важна, які поспех маецца на ўвазе. Фінансавага поспеху многія нашы музыканты сапраўды дасягаюць менавіта за мяжой — канешне, для гэтага трэба сур'ёзна працаваць, грошы не льюцца проста так быццам з рога дастатку, але прынамсі магчымасць зарабіць ёсць. Калі ты на тым жа ўзроўні сыграеш адзін і той жа канцэрт у Беларусі і ў Польшчы, там заробіш у некалькі разоў больш, і гэта, вядома ж, несправядліва. Таму музыканты з'язджаюць і вінаваціць іх у гэтым нельга. Што датычыцца міжнароднага прызнання, для гэтага не абавязкова з'язджаць: шмат музыкантаў жыве ў Беларусі і мае пры гэтым міжнародную вядомасць. Праўда, атрымаць яе складана, бо за мяжой вялікая канкурэнцыя, а ў музычных гарадах накшталт Вены, Парыжа, Лондана яна проста шалёная. Але ёсць і лакальны поспех — гэта таксама добра, калі ты робіш важныя рэчы ў роднай краіне для роднай публікі. Перспектывы для музыкантаў менавіта ў Беларусі, на мой погляд, не радасныя, бо ўсё ўпіраецца ў фінансавае пытанне: канцэрт можа як заўгодна моцна спадабацца публіцы, але калі калектыў за яго нічога не атрымае, то ў рэшце рэшт у яго не застанецца грошай на тое, каб да сваіх канцэртаў дабірацца. У нашай сферы акадэмічнай музыкі грошай няма, а калі ёсць, то па рэшткавым прынцыпе. Трэба сказаць, шмат хто з музыкантаў застаецца альбо нават вяртаецца. Я пяць гадоў пражыў у Галандыі і вярнуўся, таму што хачу быць у сваім доме — не ў чужым шыкоўным палацы, а ў маленькай кватэры, якую магу назваць домам.

— Вы казалі пра лакальны поспех, але калі ў нас няма музычнай індустрыі, а публіка вялікай любоўю да класічнай музыкі не адзначаецца, ці не з'яўляецца ён умоўным?

— Усё залежыць ад чалавека і яго запытаў. Калі ён хоча міжнароднага прызнання — робіць для гэтага адпаведныя крокі, а калі ставіць задачай данесці сваю ідэю, «любоў, братэрства і мір», — пачынае нешта іншае. У маім разуменні лакальны поспех — гэта добра, таму што мне дастаткова закрануць музыкай хоць бы аднаго чалавека. Калі са ста два-тры слухачы мяне зразумеюць, мэта дасягнута. Я адчуваю сябе медыумам паміж кампазітарам і публікай, які павінен данесці да другога ідэю першага. Само па сабе мастацтва — яно не для сябе, я перакананы, таму і задача зрабіць кар'еру не першарадная. У метро ніхто не просіць у мяне аўтограф, а ў краме не прапускаюць без чаргі, але для мяне гэта не з'яўляецца паказчыкам, таму што поспех у тым, каб данесці ідэю музычнага твора, каб аркестр прагучаў, каб атрымаўся добры канцэрт.

— Часам творчасць, гэтаму ёсць нядаўнія прыклады, сустракаецца з непаразуменнем чыноўніцкіх структур. Калі казаць пра беларускую акадэмічную музыку, ці ёсць тут нейкія сілы, што перашкаджаюць сферы музыкі развівацца?

— Развіццю нашай акадэмічнай музыкі перашкаджаюць адсутнасць належнага фінансавання і распаўсюджванае перакананне ў тым, што класіка для выбраных, хоць яна для ўсіх, проста аўдыторыю трэба выхоўваць, пачынаючы з першых класаў. Ва ўсе часы былі чыноўнікі без адпаведных ведаў, але са сваім меркаваннем. Яны ёсць паўсюль, а нам у такіх умовах трэба проста рабіць сваю справу.

— Беларуская публіка і замежная публіка — ці ёсць розніца?

— Прынцыповай розніцы няма, таму што водгук на музыку мае ірацыянальны характар: ты ўспрымаеш яе не толькі мозгам, але і сэрцам. Паўсюль жа аднолькавы водгук на словы «Я цябе кахаю» — альбо «я цябе таксама», альбо «а я цябе не», адрозненне толькі ў кантэксце. Музыка таксама альбо даходзіць, альбо не, людзі альбо прымаюць яе, альбо не, вочы ў іх альбо гараць, альбо сумуюць. І еўрапейцы вельмі рознія — ёсць скаваныя скандынавы, а ёсць экспрэсіўныя італьянцы, але водгук на музыку паўсюль адзін і той жа.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
Фота з асабістага архіва Аляксандра ХУМАЛЫ.

Запрашальнік

АД ШЫРЫНІ ГРУЗІНСКАЙ ДУШЫ

Чатыры гады таму менавіта гэты фестываль стаў першапраходцам і заклаў традыцыю правядзення дзён нацыянальных культур у Верхнім горадзе — гістарычным цэнтры сталіцы. З 2015-га «Тбілісоба» штогод прыбаўляла ў маштабнасці і насычанасці. Цяпер гэта свята грузінскай культуры, музыкі і кулінарных традыцый, якое ладзяць гандлёвая марка «Баржомі», Мінгарвыканкам, пасольства Грузіі ў Беларусі, мэрыя Тбілісі і грузінскае культурна-асветніцкае таварыства «Мамулі», афіцыйна звініць музыкай і спевамі з поўдня да поўначы, і толькі летась яго наведала каля 80 тысяч чалавек.

Сёлета «Тбілісоба» абяцае быць асаблівай — і не толькі таму, што фестываль адзначае пяцігадовы міні-юбілей, але і таму, што прысвечаны ён будзе беларуска-грузінскай дружбе і пройдзе 24 жніўня пад дэвізам «Свята з беларуска-грузінскім характарам».

Што беларускага будзе на «Тбілісобе-2019»? Найперш мова: як падкрэслівае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі Валерый Кварацхелія, як сама назва фэсту, так і ўсе ўказальнікі будуць напісаны на беларускай. Для гасцей упершыню зладзяць адкрытыя ўрокі беларускай мовы — акрамя неабходных «прывітанне» і «калі ласка», тут дапамогуць зрабіць заказ у рэстаране альбо спытаць дарогу да Нацыянальнай бібліятэкі (а беларусам, у сваю чаргу, прадэманструюць, як гучаць агульнаўжывальныя фразы на грузінскай). «Яшчэ будзе многа беларускай музыкі і кухні — прынамсі, ведаю, што будуць мае любімыя халаднік і дранікі», — запэўнівае спадар пасол, не забываючыся, аднак, запрашаць і на дэгустацыю хінкалі ды хачапуры, якія ў мностве прапануюць наведвальнікам нацыянальныя грузінскія кавярні і рэстараны.

Валерый Кварацхелія не ўтойвае: пад культурным пластом мерапрыемства знаходзіцца іншы, не менш важны — эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін, бо «Тбілісоба», даючы магчымасць беларусам і грузінам бліжэй пазнаёміцца адзін з адным, спрыяе таксама развіццю ўзаемнага турызму, інвестыцый і г. д. Не выпадкова сёлета акурат 24 жніўня ў Мінску адкрыецца Грузінскі дом — не толькі гандлёвы, але і культурна-асветніцкі цэнтр, а сярод гасцей свята будуць прэм'ер-міністр Грузіі, мэр Тбілісі і досыць вялікая дэлегацыя дэпутатаў і чыноўнікаў высокага рангу. Але сяброўства — перш за ўсё.

«З першай «Тбілісобы» пачаўся фестывальны рух у Верхнім горадзе, і як лідары гэтага руху, мы адчуваем пэўную адказнасць і задаём усё больш высокую планку, — заўважае адзін з заснавальнікаў фестывалю, дырэктар IDS Borjomi Belarus Дзяніс Крупец. — Таму сёлета мы склалі, напэўна, найцікавейшую і самую насычаную музычную праграму з найбольш вядомых і запатрабаваных на сёння грузінскіх артыстаў і прадстаўнікоў беларускай культуры».

Беларускую музыку прадставіць, у прыватнасці, папулярны электронны праект Shuma, які прэзентуе гасцям фестывалю супольны інтэрнацыянальны трэк маладых артыстаў «Мінск — горад з характарам». Таксама на «Тбілісобе» з'явіцца танцпляцоўка, дзе адбудуцца танцавальныя батлы — дзе яшчэ ў адным месцы ўбачыш лявоніху, «Муліўлуры», вог (танцавальны стыль, заснаваны на подыумнай хадзе і мадэльных позах) і кантэмпарары? Але асноўную ўвагу, безумоўна, прыцягне цэнтральная канцэртная пляцоўка — сёлета колькасць ахвотных выступіць на ёй аказалася настолькі значнай, што прывезці ўсіх не хапіла ні звычайнага авіярэйса «Эмбраера», ні нават вялікага борта «Боінга», і мэрыі Тбілісі давялося замовіць дадатковы чартарны рэйс. Сярод тых артыстаў, хто з нецярпеннем чакае сустрэчы з беларускай публікай — мужчынскае шматгалоссе «Швідкаца» (гэты віртуозны ансамбль уразіў ужо многіх слухачоў, у тым ліку канцлера ФРГ Ангелу Меркель), уладальнік першай прэміі сёлетняга дарослага конкурсу «Славянскага базару ў Віцебску» Георгій Путкарадзэ (ураджэнец Батумі ўлюбіў у сябе публіку, выканаўшы кампазіцыю «Небяспечна» беларускіх рокераў Nizkiz), леташнія прадстаўнікі краіны на «Еўрабачанні» — этна-джазавы калектыў Iriao, а таксама, мабыць, самы папулярны на сёння ў Грузіі гурт Mgzavrebi («Вандроўнікі»), адкрыты канцэрт якога завершыць фестываль.

Акрамя таго, інтрыгуе намеснік старшыні грузінскага культурна-асветніцкага таварыства «Мамулі» Лела Кантарыя, упершыню на «Тбілісобе» пройдзе «рэпетыцыя» беларуска-грузінскага вяселля, на якім тэлевядучы Тэнгіз Думбадзэ выступіць у ролі тамады, а ўсе ахвотныя стануць гасцямі і змогуць пазнаёміцца з традыцыямі і звычаямі абедзвюх краін, а таксама ўзяць удзел у конкурсе красамоўных тостаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота пададзена арганізатарамі фестывалю.

Фестываль

ПЛЮС ДВАНАЦЦАЦЬ

Vulica Brasil «здае» муралы і закрываецца карнавалам на Кастрычніцкай

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Фота Юлі САВІЧ.

Паміж фотаздымкамі сем дзён — бразільскі мастак Бруна Біг, як і дванаццаць яго калег, завяршыў свой мурал у рамках фестывалю урбан-арту Vulica Brasil. На Кастрычніцкай 16/3 цяпер красуецца маляўнічая выява «Даглядай свой сад» з пазтычнай парадай замест таго, каб ганяцца за матылькамі, клапаціцца пра свой сад і тады яны самі прылятуць. З падачы пятага Vulica Brasil у Мінску з'явілася дванаццаць новых стрыт-арт твораў: беларускія і бразільскія мастакі пачалі работу 29 ліпеня, і вось сёння — у кульмінацыйны дзень фестывалю — кожны з іх можна пабачыць у завершаным выглядзе.

А таксама адсвяткаваць поспех работы амаль што карнавалам на пешаходнай Кастрычніцкай вуліцы. Чаго толькі не адбылося за гэтыя дні: пакуль на гарадскіх паверхнях вымалёўваліся абрысы будучых твораў, удзельнікі падзеі далучыліся да майстар-класаў, кінапаказаў і творчых сустрэч, з'ездзілі на фестываль месца «Sprava» ў вёску Белая Царква, у галерэі «Ў» адкрылі выстаўку «Vulica Gallery» (заўтра закрыюць), пасадзілі лес бесперапыннага квітнення, завіталі ў дзіцячы лагер у Навасадах і падрыхтаваліся да опэн-эйру.

Vulica Brasil, як бачна, — не толькі пра вулічнае мастацтва і ўключэнне яго ў сістэму мастацтва ў грамадскім уяўленні. Фестываль кажа пра камфортнае існаванне і суіснаванне, да чаго адносіцца ўрбаністыка, архітэктура, экалогія, мода і дабрачыннасць. Зрабіўшы акцэнт на прывабных формах — упрыгажэнні горада яркімі пунктамі, Vulica Brasil апроч лагічнай тэмы гарадскога жыцця змагла закрануць і суадносіны з прыродай, і адносіны паміж людзьмі.

За гэтыя дні свае сляды на мінскіх сценах пакінулі беларускія аўтары з Мінска і іншых гарадоў — Андрэй Бусел, Poliakowa, Захар Кудзін, Хвост Хвастоў, Вадзік Фін і іншыя. Браты Густава і Атавіа Пандольфа (OSGEMEOS) з Сан-Паўлу, мастакі з міжнародным прызнаннем, стварылі ў Мінску ўжо другі мурал: у 2015 годзе на Vulica Brasil яны распісалі сцяну будынка пасольства Бразіліі ў Беларусі. Бразільцы Criola і Hyper дапаўняюць кола запрошаных аўтараў. Месцазнаходжанне навінак, як і інфармацыю пра іх ды іх аўтараў, можна знайсці на афіцыйным сайце фестывалю vulica-brasil.by.

На жаль, Мінск — пакуль недастаткова прыязны да вулічнага мастацтва горад: у Берліне выдаюцца альбомы гарадскога стрыт-арту, а мясцовая публіка ўспрымае яго з пытаннямі (некаторыя зацверджаныя пляцоўкі для будучых муралаў праз нязгоду пэўных структур былі вымушаны памяняцца), але ў тым ліку дзякуючы Vulica Brasil успрыманне нязвыклага мяняецца.

Сёння ж, 10 жніўня, прыйшоў кульмінацыйны момант. «Рабочыя» дні фестывалю скончыліся — час для музыкі, танцаў, тэатра, ежы, кірмашу і іншага. Опэн-эйр зойме Кастрычніцкую вуліцу, і такім чынам пятая Vulica Brasil (папярэдняя прайшла ў 2017 годзе) падыдзе да прыгожага фіналу.

Фэст арганізуецца пры падтрымцы пасольства Бразіліі ў Беларусі, Мінгарвыканкама, Міністэрства культуры і адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

ДОЎГІ ШЛЯХ ДА ПСІХІЯТРА

Тэлефоны даверу Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія»:

8 017 202 04 01
8 029 899 04 01

Тэлефануйце, калі ў вас крызісная сітуацыя. Псіхалагічная дапамога аказваецца кругласутачна, ананімна, бясплатна.

Якія хваробы выходзяць у лідары ў XXI стагоддзі? Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць, што разам з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі і анкалогіяй — псіхічныя расстройствы. Найбольшы працэнт псіхічных адхіленняў рознага роду, пачынаючы ад трывожна-дэпрэсіўных станаў і заканчваючы цяжкімі формамі шызафрэніі, прыпадае на самыя развітыя краіны свету. Але, калі ў заходніх краінах пры ўзнікненні адпаведных праблем людзі, як правіла, тут жа ідуць да спецыяліста і не бачаць у гэтым нічога ганебнага, то беларусы могуць цягнуць да апошняга.

Вось гісторыя ад першай асобы — 18-гадовай Марыны (імя гераіні зменена. — Аўт.), якой прыйшлося літаральна ваяваць з бацькамі, даказваючы, што ёй дрэнна, і молячы, каб тыя адвялі яе да доктара.

«Я не разумела, што са мной адбываецца»

— Недзе гадоў з 12—13 я стала нервовай, у мяне былі незразумелыя істэрыкі. Мяне неслі некіруемыя эмоцыі. Гэта выяўлялася ў зносінах з сябрамі, на вуліцы... Людзі ўспрымалі мяне як агрэсіўную. Прыблізна ў гэты ж час наша сям'я пераехала ў Мінск, і для мяне гэта стала стрэсам. Да гэтага я па жыцці ішла са сваёй стрыечнай сястрой. У нас паўгода розніцы, мы з ёй літаральна ў адной калясцы раслі, заўсёды былі разам, як блізняты. І вось яна засталася, а я паехала ў сталіцу.

Мне было самотна. Ды яшчэ рабілася нешта незразумелае: то ўспышкі актыўнасці, калі я нешта энергічна рабіла, кнігі чытала без перапынку — то цэлымі суткамі залівалася слязамі. Бацькі амаль нічога не заўважалі: я плакала бязгучна, не прыцягваючы да сябе ўвагі, і ні пра што ім не казала. Я проста не разумела, што са мной адбываецца! Гэта пазней я стала капацца ў тэме, чытаць адпаведную літаратуру...

Да доктара я трапіла толькі нядаўна. Мне доўга давялося ваяваць з бацькамі, даказваць ім, што мне дрэнна. Спачатку я казала: адвядзіце мяне да псіхолага, пазней ўжо закрычала: адвядзіце да псіхіятра! Мае бацькі не тое каб адмаўляліся, яны проста казалі: так-так, трэба нешта рабіць... І нічога не рабілі.

Збоку, напэўна, было цяжка зразумець, што са мной нешта адбываецца. За межы майго пакоя практычна нічога не выходзіла, хіба што навакольныя лічылі мяне крыху дэпрэсіўнай.

Мне казалі: ты сабе ўсё надумала, гэта падлеткавае і хутка пройдзе... Але калі мне споўнілася 17 гадоў, мяне ледзь не выключылі з каледжа — з-за прагулаў і праблем з вучобай. Самае крыўднае ў тым, што мне вельмі падабаецца мая будучая прафесія. Але калі ты ў дэпрэсіўнай фазе, то проста ляжыш, і можаш ляжаць так цэлыя суткі — спаць і плакаць, плакаць і спаць. І адчуваеш пры гэтым такую моцную слабасць, што проста не ў стане падняцца. Так што мне падабалася будучая спецыяльнасць, але я не магла хадзіць на заняткі, і ад гэтага станавілася яшчэ горш — адчуваеш сваё бяссілле і зноў плачаш. Атрымліваецца так, што ты нічога не хочаш, нават ляжаць не хочаш, проста гэта ўсё, на што ты здольная...

Калі мы з мамай усё ж пайшлі да псіхіятра, то не сталі звяртацца да бясплатнага, таму што, гэта, напэўна, менталітэт у нас такі: здаецца, што цябе тут жа замкнуць у псіхушку. Таму мы адправіліся на платны прыём, з захаваннем ананімнасці. Бацькі хацелі пераканацца: у мяне сапраўды праблемы ці я гэта сабе прыдумала. І доктар пацвердзіў, што праблема існуе. Мне паставілі дыягназ «біпалярнае афектыўнае расстройства», раней яго называлі дэпрэсіўна-маніякальным псіхозам. Ні на якім уліку я не знаходжуся, бо хаджу да доктара на платны прыём.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пры гэтым захворванні паслядоўна праходзіш праз некалькі фаз: фазу дэпрэсіі, фазу манііі і рэмісію. І яны могуць быць вельмі розныя па інтэнсіўнасці. У мяне разбежка ідзе ад цяжкай дэпрэсіі да гіпаманіі, гэта значыць, манія не вельмі моцна выяўленая. А вось моцна выяўленая манія можа быць небяспечнай. Пазней мама мне сказала, што ў майго дзядулі былі такія ж праблемы. І ў яго манія была ярка выяўленай. Ён у гэтай фазе прадаваў рэчы з дому, нападпітку ўвальваўся ў дзяржустановы, усім расказваў, што падарожнічаў у Тыбет, хоць ніколі там не быў... Праўда, у яго ўсё складалася яшчэ адносна нядрэнна. Таму што чалавек у яго стане часам сябе не кантралюе і можа пускацца ў небяспечныя авантуры, пайсці на рабаванне банка, напрыклад, ці нават здзейсніць забойства.

Урач-псіхіятр даволі хутка падабраў мне лячэнне, хіба што адзін раз прыйшлося скарэктаваць дозу. Цяпер я п'ю тры таблеткі ў дзень і адчуваю сябе нашмат лепш. Я не хаваю сваіх праблем ні ад аднакурснікаў, ні ад знаёмых — яны ведаюць аб маім дыягназе. Я не вельмі адчувальная да таго, што пра мяне кажуць за спінай. Чужое меркаванне мяне не вельмі хвалюе. Маё асяроддзе, дарэчы, усё нармальна ўспрыняло. Нават калі і былі нейкія негатыўныя рэакцыі, то яны да мяне не дайшлі. Не ўсе, дарэчы, да канца разумеюць, што ў мяне такое. Некаторым я спрабавала растлумачыць, але не ўпэўнена, што гэта магчыма: калі не адчуў гэта на сваёй шкуры, да канца ўсё роўна не зразумееш. І не ад усіх людзей я буду патрабаваць разумення.

У цэлым, я не моцна змянілася з-за таблетак, за выключэннем таго, што зараз «не выключаюся» на некалькі месяцаў, гэта значыць не сыходжу ў дэпрэсію. Праўда, адначасова з гэтым знікла і фаза гіпаманіі, а яна ў цэлым досыць прыемная. У такі перыяд за кароткі прамежак часу ты можаш перарабіць кучу спраў, разабрацца з усімі запазычанасцямі па вучобе, прачытаць кучу кніг — энергія з цябе проста прэ. Але я не шкадую, што гэта прайшло, бо раней гэта заўсёды прыводзіла да «адмашкі» — дэпрэсіўнай фазы, якая цягнулася некалькі месяцаў. Так што лепш так, чым як было раней.

Акрамя таблетак, дапамагае яшчэ, як ні банальна гучыць, наладжаны рэжым, асабліва рэжым сну. Я доўга не магла з гэтым змірыцца, але ў рэшце рэшт супакоілася, калі зразумела, што гэта насамрэч «працуе». Цяпер вечарынкі да раніцы — не для мяне.

Я думаю, у нас у краіне ходзіць нямала людзей з маім дыягназам, проста яны пра гэта не ведаюць. Яны думаюць, што ў іх такі характар, ці так абставіны складваюцца, і таму ім так дрэнна... Пакутуюць, церпяць такое жыццё, хоць можна было б зрабіць яго больш лёгкім.

Святлана БУСЬКО.

❍ КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

«ПРА НАС УСЁ ЯШЧЭ ХОДЗІЦЬ ЗАНАДТА ШМАТ СТРАШЫЛАК»

Урач-псіхіятр-нарколаг, намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» Кацярына КАТАРГІНА:

— Пры такім дыягназе як у Марыны, чалавеку, як правіла, патрабуецца медыкаментозная дапамога, а не проста псіхатэрапія. Пры гэтым лекі могуць быць дастаткова эфектыўныя. Праўда, біпалярнае расстройства сустракаецца адносна рэдка, прыкладна ў 1 % насельніцтва. А вось дэпрэсія — значна часцей. Паводле сусветнай статыстыкі, на яе пакутуе ад 5 да 15 % усяго насельніцтва. У цэлым лічыцца, што кожны пяты чалавек мае патрэбу ў дапамозе псіхатэрапеўта як мінімум адзін раз у жыцці — такія вось рэаліі.

Пры гэтым людзі да гэтага часу баяцца да нас звяртацца. Хоць у апошнія гады сітуацыя ўсё ж крыху змянілася. З'явіўся платны прыём на ўмовах ананімнасці — і гэта адыграла сваю ролю. Да нас стала больш прыходзіць людзей з неўратычным станам, з дэпрэсіяй, трывогай.

Але многія ўсё яшчэ працягваюць думаць, што калі трапіш на прыём да псіхіятра, цябе пакладуць у псіхіятрычную бальніцу, і ўсё — на сваім лёсе можна паставіць крыж, не зможаш працаваць і гэтак далей. На самай справе ўсё далёка не так. Больш за тое, чалавека, нават калі ён хворы, нельга шпіталізаваць у псіхіятрычную клініку без яго згоды. Гэта прапісана ў законе «Аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі».

Хоць і тут ёсць свае выключэнні. Напрыклад, чалавека пакладуць у псіхіятрычную бальніцу без яго згоды, калі ў яго востры псіхоз, ён не разумее, што робіць, і ажыццяўляе дзеянні, якія могуць быць небяспечныя для сябе і навакольных. Калі чалавек знаходзіцца ў такім стане, любы доктар, не абавязкова псіхіятр, мае права выклікаць хуткую псіхіятрычную дапамогу і яшчэ абавязкова — міліцыю. Таму што толькі міліцыя мае права «зафіксаваць» чалавека, але не медыкі.

Яшчэ бываюць сітуацыі, калі чалавек становіцца бездапаможным з прычыны псіхічнага расстройства. Напрыклад, калі ў яго развілося небяспечнае для жыцця знясіленне з-за анарэксіі. Але нават у гэтым выпадку шпіталізацыя магчымая толькі пасля санкцыі пракурора. Так што закон стаіць на варце інтарэсаў пацыента.

Цяпер яшчэ пра адну страшылку. Што ж адбываецца, калі чалавек сам звяртаецца да ўрача-псіхіятра? А адбываецца вось што. Калі доктар выставіць дыягназ цяжкага псіхічнага расстройства, то чалавека паставяць на дыспансерны ўлік і будуць яго лячыць і дынамічна назіраць. Але ў 70 % выпадкаў зваротаў чалавеку ставіцца дыягназ, які не цягне за сабой пастаноўку на ўлік! Калі выстаўлены дыягназ няцяжкага псіхічнага парушэння, могуць проста завесці картку.

На што гэта можа паўплываць у будучыні?

Калі чалавек уладкоўваецца на работу з прафесійнымі шкоднасцямі, ён павінен прайсці медкамісію. І наша камісія вельмі рэдка не выдае дазволу на работу. Так, ёсць віды работ, якія нашым пацыентам процітаказаныя. Але людзі палохаюцца, лічаць, што з псіхіятрычным дыягназам ім могуць не дазволіць працаваць наогул. Хоць, па вопыце, у 95 са 100 выпадкаў мы даем дазвол на работу.

Калі ж чалавек уладкоўваецца на работу, якая не патрабуе праходжання медкамісіі, то ніхто не будзе чыніць яму ніякіх перашкод.

Некаторыя дыягназы могуць адбіцца на праве на кіраванне аўтамабілем. Напрыклад, гэта датычыцца разумовай адсталасці або шызафрэніі ў востры стадыі. Але ў людзей з неўрозамі праблем з гэтым ніякіх не будзе.

Наогул, інфармацыя аб факце звароту па меддапамогу або аб дыягназе з'яўляецца ўрачэбнай тайнай. Выдаванне яе без згоды пацыента будзе з'яўляцца парушэннем закона.

Важна не баяцца прыходзіць да нас па дапамогу, таму што наступствы на самай справе несувымерныя. Калі гэта псіхоз, часцей за ўсё тое заўважаць родныя і блізкія, а не сам чалавек. І яго наступствы будуць значна больш і мацнейшыя, чым наступствы нейкіх абмежаванняў з-за яго. У большасці выпадкаў такі чалавек усё роўна трапіць да доктара, праз міліцыю ці нейкім іншым шляхам, але вывесці яго з гэтага стану будзе ўжо значна больш складана. Бо чым даўжэй доўжыцца псіхоз, тым складаней з яго выйсці. Таму так важна не цягнуць і звяртацца па медыцынскую дапамогу своечасова.

Нават калі ў чалавека хранічнае псіхічнае расстройства, як правіла, практычна заўсёды можна дамагчыся рэмісіі. Я не бачыла яшчэ ніводнага пацыента, які б усё жыццё быў у стане псіхозу. Час ад часу яго стан усё роўна можа абвастрацца, але, па меншай меры, і сам чалавек, і яго сям'я будуць ведаць, што пры гэтым рабіць, таму што ім усё раскажа доктар.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«СМАРТ БОНУС»

Настоящие Правила проведения Рекламной игры «Смарт Бонус» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения Рекламной игры «Смарт Бонус» (далее – Рекламная игра).

Рекламная игра «СМАРТ БОНУС» проводится с целью стимулирования осуществления безналичных платежей, реализации розничных банковских услуг Альфа-Банка, привлечения новых клиентов, через подключение к одному из Пакетов услуг Alfa Smart (далее – Пакет решений Alfa Smart).

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «Альфа-Банк», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 43-47.

3. Участники Рекламной игры.

Участниками Рекламной игры могут быть граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане с видом на жительство в Республике Беларусь, открывшие в Альфа-Банке текущий (расчетный) счет, к которому выпущена банковская платежная карточка (далее – Карта).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства, а также члены Комиссии. Кроме этого, Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Альфа-Банком.

4. Наименование Рекламной игры – «Смарт Бонус».

5. Территория проведения Рекламной игры.

Рекламная игра «Смарт Бонус» проводится на территории Республики Беларусь.

6. Срок начала и окончания Рекламной игры.

Рекламная игра проводится в период с **12 августа 2019 года по 22 декабря 2019 года.**

7. Состав комиссии по проведению Рекламной игры:

Для контроля за соблюдением Правил, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель комиссии: Корженок Екатерина Сергеевна, главный специалист отдела маркетинга и рекламы ЗАО «Альфа-Банк».

Заместитель председателя комиссии: Воробей Владимир Сергеевич, специалист по маркетингу ООО «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА».

Прыгунова Ольга Юрьевна, специалист по маркетингу ООО «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА».

Богуш Дарья Дмитриевна, специалист 2-й категории отдела маркетинга и рекламы ЗАО «Альфа-Банк».

Чикилева Елена Александровна, специалист по маркетингу ООО «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА».

8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры.

Для участия в Рекламной игре необходимо:

В период с 00.00 12.08.2019 по 23.59 31 октября 2019 года:

Подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре при оформлении заявления на подключение к Пакету решений Alfa Smart в любом отделении Альфа-Банка по короткому номеру 198 (звонок бесплатный) или в чате мобильного приложения InSync.by.

Уплатить по одному из подключенных клиентом Пакетов решений Alfa Smart: Smart Classic, Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black комиссию за обслуживание по Пакету решений либо выполнить **один из критериев** бесплатности соответствующего Пакета решений Alfa Smart.

Критерий бесплатности	Alfa Smart			
	Smart Classic	Smart Gold	Smart Platinum	Smart Black
Количество транзакций, шт.	15	30	-	-
Сумма транзакций по всем картам, бел. руб. *За календарный месяц*	250	500	1250	2500
Зачисления заработной платы, бел. руб. *Учитываются все зачисления в рамках зарплатного проекта за календарный месяц*	500	1000	2500	5000
Среднедневные остатки на счетах в течение календарного месяца, бел. руб.	500	1000	2500	5000
Среднедневные остатки по депозитам в течение календарного месяца, бел. руб.	5 000	20 000	50000	100 000
Комиссия, бел. руб.	4,9	6,9	14,9	49,9

При невыполнении критерия бесплатности в течение календарного месяца у участника Рекламной игры с банковского счета списывается комиссия за пользование пакетом.

2. По состоянию на 5 ноября 2019 года быть подключенным к одному из Пакетов решений Alfa Smart.

При выполнении условий игры **начисление шансов** происходит следующим образом:

Пакет	Один шанс в розыгрыше №
Smart Classic	1
Smart Gold	1 и 2
Smart Platinum	1,2 и 3
Smart Black	1,2,3 и 4

Наличие шансов анализируется 5 ноября 2019 года.

№ розыгрыша	Разыгрываются Призы
1	Приз № 1 и 2
2	Приз № 3
3	Призы № 4 и № 5
4	Приз № 6

Если клиент в период с 00.00 12.08.2019 по 23.59 31 октября 2019 года переподключается с пакета на пакет, то на дату 5 ноября 2019г. засчитывается выполнение условий игры по текущему подключенному пакету.

9. Состав и размер Призового фонда в белорусских рублях и источник его формирования.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица – Закрытого акционерного общества «Альфа-Банк».

Размер Призового фонда составляет **27 451,10 (двадцать семь тысяч четыреста пятьдесят один) белорусский рубль, 10 (десять) копеек.**

Таблица № 1

№	Наименование	Название Приза далее в Правилах	Кол-во, шт	Цена, бел. рублей	Общая стоимость, бел. рублей
1	Подарочный образовательный сертификат в студию иностранных языков POLYGLOT.BY, на сумму 100 руб. Срок действия сертификата до 24.07.2020 г.	Приз 1	60	100,00	6 000, 00
2	Подарочный сертификат VIP в Аквапарк «Лебяжий». Услуга «посещение на целый день акватории + бани/сауны Территории SPA». Срок действия сертификата с 15.11.2019 г. по 15.01.2020 г.	Приз 2	30	100,00	3 000, 00
3	Подарочный сертификат номиналом 150 руб. на физкультурно-оздоровительные услуги в сети фитнес-клубов «Адреналин». Действителен в период с 14.11.2019 г. по 31.03.2020 г.	Приз 3	60	150, 00	9000, 00
	Денежные средства			2,84	170,40
4	Подарочная карта номиналом 300 руб. в сеть магазинов «Кравт». Срок действия карты 6 месяцев с 22.07.2019 г.	Приз 4	10	300, 00	3 000, 00
	Денежные средства			25,25	252,50
5	Подарочный сертификат в «Школу красоты Натальи Дичковской». Срок действия сертификата с 15.11.2019 по 15.08.2020 г.	Приз 5	10	300, 00	3 000, 00
	Денежные средства			25,25	252,50
6	Подарочный сертификат на услуги питания в Гастро-Баре Butterbro номиналом 500 руб., срок действия сертификата с 14.11.2019 г. по 15.02.2020 г.	Приз 6	5	500, 00	2 500, 00
	Денежные средства			55,14	275,70
ИТОГО:					**27 451,10**

10. Место, дата, время и порядок розыгрыша Призового фонда, порядок определения победителей Рекламной игры.

10.1. К каждому розыгрышу данные об участниках Рекламной игры и шансов каждого Участника Рекламной игры формируются Организатором в список для розыгрыша, который включает в себя: ФИО Участника Рекламной игры, мобильный телефон, номер шанса, дату уплаты комиссии за Пакет решений или дату окончания отчетного периода за который клиент выполнил один из критериев бесплатности (последняя календарная дата месяца).

Для каждого розыгрыша Организатор формирует отдельный список, где присваивает каждому шансу один порядковый номер, начиная с 0000001 и выше.

Списки формируются в алфавитном порядке начиная с буквы А, по фамилии, имени, отчеству участника.

10.2. Розыгрыши Призового фонда проводятся открыто в присутствии Комиссии в офисе ЗАО «Альфа-банк» по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 43.

В розыгрышах принимают участие шансы, которые были получены участниками за выполнение условий участия в Рекламной игре.

10.2.1. Розыгрыш № 1 состоится **14 ноября 2019 года в 13.00.**

Разыгрываются Призы № 1, 2.

В розыгрыше принимают участие клиенты Пакетов решений Smart Classic, Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black.

10.2.2. Розыгрыш № 2 состоится **14 ноября 2019 года в 13.45.**

Разыгрывается Приз № 3.

В розыгрыше принимают участие клиенты Пакетов решений Smart Gold, Smart Platinum, Smart Black.

10.2.3. Розыгрыш № 3 состоится **14 ноября 2019 года в 14.15.**

Разыгрываются Призы №№ 4, 5.

В розыгрыше принимают участие клиенты Пакетов решений Smart Platinum, Smart Black.

10.2.4. Розыгрыш № 4 состоится **14 ноября 2019 года в 14.45**.

Разыгрывается Приз № 6.

В розыгрыше принимают участие клиенты Пакета решений Smart Black.

10.3. На каждый зарегистрированный порядковый номер шанса, Организатор оформляет одну карточку Участника, которая содержит: порядковый номер шанса Участника, фамилию и имя Участника.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в таблице № 1 п. 9 правил.

Все карточки Участников, участвующие в розыгрыше Приза, засыпаются в лототрон и перемешиваются.

Один из членов комиссии достает из лототрона последовательно одну за другой необходимое количество карточек Участника – так определяются победители, т. е. обладатели Приза.

Карточки Участников, ставших победителями розыгрыша Приза, извлекаются из лототрона и не принимают участие в последующем розыгрыше.

11. Место, порядок и срок выдачи Призов и уведомления победителей.

Победители уведомляются о выигрыше по почте и по телефону. Победители розыгрышей Рекламной игры уведомляются не позднее **22 ноября 2019 года**.

После получения уведомления о выигрыше победитель должен до 22 декабря 2019 г. в любой рабочий день с 12.00 до 17.00 либо субботу с 10.00 до 13.00 прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 20/11, офис 509 с предварительным согласованием даты и времени прибытия победителя с представителем Организатора по телефону +375 17 312 12 76.

При получении Приза Победитель должен предъявить документ, удостоверяющий личность (действующий паспорт гражданина Республики Беларусь или вид на жительство).

Также победитель может получить Приз при помощи почтового отправления.

Для этого необходимо в срок до 5 декабря 2019 г.:

по телефону Организатора Рекламной игры +375 17 312 12 76 сообщить о желании получить Приз путем почтового отправления;

отправить на электронный адрес Организатора Рекламной игры (info@rapka.by):

– файл-изображение 25-й, 31-й и 33-й страниц паспорта победителя;

– сообщение с указанием адреса (город, улица, номер дома, квартира, индекс), на который необходимо отправить Приз.

При соблюдении вышеперечисленных условий, Организатор Рекламной игры в срок до 12.12.2019 г., отправляет Приз победителю Рекламной игры при помощи почтовой связи.

В случае отказа победителя от получения Приза, неполучения Приза в установленными правилами порядке и сроке либо невыполнения условий его получения Приз Признается невостребованным и остается у Организатора.

В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Призов №№ 3, 4, 5, 6 выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя Приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя по причине отсутствия денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя Организатор обязан в месячный срок со дня выявления указанных фактов направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

Организатор не несет ответственности за возникновение необходимости уплаты дополнительного подоходного налога и иных выплат, связанных с получением Призов, за пределами Республики Беларусь.

Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов.

Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих Призов.

Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Призов и их эксплуатацией, возникшие после их передачи Победителям.

12. Прочие условия.

Участие в Рекламной игре автоматически подразумевает ознакомление с полным текстом настоящих Правил и согласие Участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником настоящих Правил считается его отказом от участия в Рекламной игре со всеми вытекающими последствиями (включая утерю права на получение Приза и т. п.).

Организатор не вступает в споры между Участниками относительно определения собственника выигранного Приза и/или претендентов на получение Приза, организации и условий передачи Призов. Приз получает Победитель. Победитель вправе распорядиться полученным Призом по своему усмотрению.

В случае если Победителем является несовершеннолетний, то при получении Приза вместе с Участником должны присутствовать его законные представители (родители, усыновители, опекуны, попечители) со своим паспортом (видом на жительство) и свидетельством о рождении либо паспортом несовершеннолетнего.

Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются принимать участие в рекламной видеосъемке, что их фамилии, имена, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Заинтересованному лицу.

Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, офис 509.

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на интернет-сайте www.alfabank.by, а также по телефонам контакт-центра «Альфа-Консультант»: 198, +375 (29, 44, 25) 733 33 32 круглосуточно.

13. Порядок информирования об условиях и результатах Рекламной игры

Правила проведения Рекламной игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Рекламной игры в газете «Звязда», а также размещаются на сайте www.alfabank.by.

Информация о результатах розыгрыша публикуется до 15.12.2019 года в газете «Звязда», а также размещается на сайте www.alfabank.by.

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3611 от 08.08.2019 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГОСУДАРСТВЕННОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «ЩУЧИНСКАЯ МПМК-166»

Предмет торгов	Начальная цена без НДС, руб.	Размер задатка, руб.
Лот № 1 – Экскаватор Борекс 2102, 2007 г.в., рег. знак СА-4 8649	6 801,72	680,17
Лот № 2 – Полуприцеп платформа тентовая МАЗ 975800-013, 2008 г.в., рег. знак А 2119 А-4	3 742,08	374,21
Лот № 3 – Экскаватор ЕК 18-20, 2008 г.в., рег. знак СА-4 9584	24 431,10	2 443,11
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»	
Номер р/с для перечисления задатка	р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» РД №100 по Брестской обл., г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245	
Условия оплаты	в соответствии с заключенным договором купли-продажи	
Условия продажи	без условий	
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, возмещение затрат Организатору аукциона		
Аукцион состоится 21 августа 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325		
Информацию об аукционе можно узнать по телефонам: 8 (0162)-20-92-13, 21-88-81		
Заявления на участие принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в раб. дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений **– 20 августа 2019 г. до 17.00**		
Ранее извещение о продаже имущества государственного предприятия «Щучинская МПМК-166» было опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2019 г.		

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91» (Продавец)

Лот №1: UAZ 452 кузов (рама) № 390900A0206122, 1988 г. в. Начальная цена с НДС – 2 990,88 бел. руб. Задаток – 299,09 бел. руб. Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, 17. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится **22.08.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 22.08.2019 (Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 20.08.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.03.2019.

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by

Пярэпалах у Гімалаях

Што адбываецца ў Кашміры?

Насамрэч гістарычныя падзеі адбываюцца на гэтым тыдні ў Індыі. З падачы ўрада прэзідэнт краіны Рам Натх Кавінд падпісаў указ аб адмене асаблівага статусу штата Джаму і Кашмір і падзеле яго на дзве тэрыторыі. Па словах міністра ўнутраных спраў Індыі Аміт Шаха, які прадставіў дакумент у парламенце, сітуацыя патрабуе прыняцця рашучых мер па рэарганізацыі гэтай адміністрацыйнай адзінкі. Спачатку рашэнне ўрада ўхвалила верхняя палата — Радж'я Сабха, а пасля ніжняя — Лок Сабха. Такім чынам, дакумент уступіў у законную сілу. Дагэтуль Джаму і Кашмір меў аўтаномію, у гэтым штаце усе законы, прынятыя цэнтральным урадам (за выключэннем тых, што датычацца сфер абароны, знешніх сувязяў), павінны былі праходзіць праз адабрэнне мясцовай асамблеі. Штат меў уласны сцяг. Навошта ў Індыі ліквідавалі аўтаномію?

ПРЫВАБНЫ «КАВАЛАК»

Вытокі Кашміра ідуць ад старажытнага гандлёвага горада Срынагар, размешчанага ў высакагор'і Гімалаяў (цяпер гэта летняя сталіца Джаму і Кашміра). У сваёй доўгай і поўнай перамен гісторыі паселішча было скрыжаваннем караванных шляхоў (у тым ліку легендарнага Шаўковага шляху) паміж Далёкім і Блізкім Усходам, Сярэдняй і Паўднёвай Азіяй. Поўнач Кашміра спрадвеку была заселена пераважна прыхільнікамі ісламу, поўдзень — індуістамі, а ўсход — будыстамі. Аднак у цэлым, як лічыцца, канфесіям удавалася вытрымліваць неабходны баланс у адносінах і выпрацаваць агульную ідэнтычнасць. З 1846-га цягам стагоддзя Кашмір быў дзяржавай, якую брытанская каланіяльная адміністрацыя фактычна прадала махараджам.

Стратэгічная тэрыторыя — прывабны «кавалак», а таму з'яўляецца прадметам жорсткай спрэчкі з 1947 года, калі Брытанская Індыя, атрымаўшы незалежнасць, падзялілася на дзве дзяржавы па рэлігійнай прыкмеце — Дамініён Пакістан і Індыйскі Саюз. Фарміраванні, якія знаходзіліся пад прамым брытанскім кіраваннем, падзялілі лёгка, а вось са шматлікімі напаўнезалежнымі княствамі паўсталі праблемы. Тэарэтычна ў іх быў выбар: далучыцца да Індыі ці Пакістана, паспрабаваць захаваць незалежнасць альбо аб'яднацца і стварыць уласную дзяржаву. Кіраўнік княства Джаму і Кашмір махараджа Хэры Сінгх доўга спрабаваў балансаваць. Аднак пасля таго, як паўстала частка яго войска, вымушаны быў папрасіць Нью-Дэлі аб дапамозе. Ён яе атрымаў, але ў абмен на ўключэнне Джаму і Кашміра ў склад Індыйскага Саюза, хай і з асаблівым статусам. Гэта вядома ж выклікала масавую незадаволенасць насельніцтва княства.

Першы прэм'ер-міністр незалежнай Індыі Джавахарлал Нэру лічыў, што наданне асаблівага статусу гэтаму штату дапаможа супакоіць сітуацыю. Таму, паводле канстытуцыі Індыі, якая ўступіла ў сілу ў 1950 годзе, тэрыторыя атрымала адмысловую аўтаномію. Цяпер Нью-Дэлі кантралюе 60 працэнтаў тэрыторыі былога княства Джаму і Кашмір. Менавіта на ёй быў створаны адпаведны штат. Пад кантролем Пакістана знаходзіцца амаль трэць тэрыторыі, дзе ўтвораны правінцыя Гілгіт-Балтыстан (раней — Паўночныя тэрыторыі) і «часова незалежны» Азад-Кашмір (непрызнаная дзяржава Свабодны Кашмір). Яшчэ каля 10 працэнтаў плошчы (рэгіён Аксайчын, які мае стратэгічную важнасць, паколькі праз яго праходзіць дарога з Тыбета ў Сіньцзян) знаходзіцца з 1962 года пад кантролем Кітая.

МІНУС ШТАТ

Мусульмане складаюць большасць мясцовага насельніцтва. Прычым калі ў цэлым у Джаму і Кашміры іх пражывае 67 працэнтаў, то ў кашмірскай даліне за гэтымі вернікамі абсалютная большасць — 97 працэнтаў насельніцтва. Акрамя таго, тут ёсць і рэгіёны з іншым раскладам. У Джаму 65 працэнтаў насельніцтва — індуісты, а мусульман толькі 31, у Ладакху каля паловы жыхароў — будысты. Этнаканфесійныя супярэчнасці ў Джаму і Кашміры з'яўляюцца адной з галоўных прычын актывізацыі ў рэгіёне экстрэмісцкіх груповак. Кашмірскія радыкалы атабарыліся ў кантраляваным Ісламабадам Азад-Кашміры і карыстаюцца поўнай падтрымкай з боку пакістанскіх спецслужбаў. Менавіта тэрарыстычная актыўнасць і стала адной з галоўных прычын, па якіх у Нью-Дэлі вырашылі абмежаваць аўтаномію. На думку індыйскіх улад, рашэнне па змене статусу Джаму і Кашміра будзе спрыяць яго эканамічнаму развіццю і прытоку сюды капіталу, рашэнню сацыяльных праблем, у тым ліку вяртанню сем'яў індусаў, больш за 150 тысяч якіх, па розных ацэнках, вымушана пакінулі гэтыя мясціны ў 1990-я з-за нападаў ісламскіх фундаменталістаў.

«Гэтае рашэнне будзе ўпісана ў гісторыю нашай краіны залатымі літарамі. На будучыя дзесяцігоддзі Джаму і Кашмір будуць моцна прывязаныя да Індыі», — такія словы Аміт Шах — кіраўнік МУС Індыі і прэзідэнт кіруючай Бхаратыя джаната парты (БДП) — вымавіў у ніжняй палаце індыйскага парламента тлумачачы беспрэцэдэнтны палітычны крок урада: рашэнне адмяніць дзеянне двух артыкулаў канстытуцыі, якія надавалі асаблівы статус Джаму і Кашміру, і правесці яго тэрытарыяльную рэарганізацыю. Днямі гэты штат афіцыйна стаў саюзнай тэрыторыяй (з адпаведным прававым статусам), таксама як і вобласць Ладакх, што ад яго аддзялілася. Дагэтуль краіна складалася з 29 штатаў і 7 саюзных тэрыторый. Апошнія адміністрацыйныя адзінкі валодаюць меншымі правамі, чым штаты, яны не маюць губернатараў і кіруюцца непасрэдна з цэнтра, але некаторыя з іх (напрыклад, Нацыянальная сталічная тэрыторыя Дэлі, саюзная тэрыторыя Пудучэры) маюць свае заканадаўчыя органы.

Наўрад ці радыкальнае рашэнне стала нечаканым сюрпрызам: пункт аб пераглядзе статусу Джаму і Кашміра значыўся ў праграме Бхаратыя джаната парты яшчэ з 1951 года. Але ні разу дагэтуль БДП і яе саюзнікі не мелі ў парламенце такой перавагі, якая дазваляе гарантавана правесці біль, і да таго ж цалкам лаяльнага прэзідэнта. Да ўсяго іншага рашучыя крокі падтрымалі і многія апазіцыйныя партыі. Тыя, хто выступіў супраць (Індыйскі нацыянальны кангрэс, левыя і шэраг рэгіянальных партый), заклапочаны ў асноўным не ўласна статусам Джаму і Кашміра, а самім метадам, які выкарыстала кіруючая партыя, каб правесці патрэбнае рашэнне. Як заўважаюць апазіцыйныя палітыкі, такім чынам можна распусціць любы штат у Індыі. Аднак, мяркуючы па рэакцыі прэсы і сацсетак, гэтыя аргументы мала каго хвалююць. Пераважная большасць індыйцаў падтрымлівае рашэнне ўрада.

ДЖЫН НА СВАБОДЗЕ

У Кашміры Бхаратыя джаната партыя стварыла максімальна зручную для прыняцця рашэння сітуацыю — выйшла з урада штата, пасля чаго ён перастаў існаваць. Разумеючы, што хваляванняў і незадаволенасці не пазбегнуць, індыйскія ўлады добра да іх падрыхтаваліся. Загадзя пад рознымі падставамі яны вывезлі турыстаў і паломнікаў і перакінулі ў штат дадатковыя вайсковыя і паліцэйскія падраздзяленні. Адразу пасля абвяшчэння аб рэарганізацыі ў Джаму і Кашміры былі адключаны сотавая сувязь і інтэрнэт, закрыты навучальныя ўстановы, арыштаваны магчымыя лідары пратэсту, у тым ліку кіраўнікі мясцовых палітычных партый. Падрыхтоўка, мяркуючы па ўсім, вялася і на знешнепалітычным узроўні: індыйцы акуратна празандзіравалі пазіцыю ўсіх буйных гульцоў, высвятляючы, як яны могуць зрэагаваць у выпадку змены статусу Кашміра. І калі пераканаліся, што сур'ёзных наступстваў не будзе, пачалі дзейнічаць хутка і рашуча, не дапусціўшы ніводнай уцечкі інфармацыі.

За Кашмір ужо былі тры вайны. Пасля першай — у 1947—1949 гадах — адбыўся падзел тэрыторыі. Другая пачалася ў 1965-м з-за спроб Пакістана справакаваць паўстанне ў індыйскай частцы Кашміра. Пагадненне аб урэгуляванні было падпісана ў Ташкенце ў студзені 1966 года. У 1971-м адбылася новая вайна, у якой Пакістан пацярпеў цяжкае паражэнне і пазбавіўся анклава на ўсходзе Індыі, на тэрыторыі якога пасля была абвешчана дзяржава Бангладэш. У выніку сёння эканоміка рэгіёна няўстойлівая, як і палітычная сітуацыя ў ім. У Кашміры высокае беспрацоўе. Штогод тут гінуць сотні мірных жыхароў.

Пазбаўленне рэгіёна незалежнасці прывядзе да эскалацыі напружання і росту сепаратызму, адзначаюць эксперты. Кашмірскія палітыкі параўналі гэты крок з «вызваленнем джына з бутэлькі». Варта чакаць як масавых беспарадкаў, так і тэрактаў. Актывізуюць сваю дзейнасць радыкальныя групоўкі, якія дзейнічаюць з тэрыторыі Азад-Кашміра. У непрызнанай дзяржаве базуюцца тысячы баевікоў, дакладную іх колькасць назваць не можа ніхто. Рашэнне ўладаў Індыі здольнае прыцягнуць у шэрагі радыкалаў пэўную частку кашмірскай мусульманскай моладзі. Дарэчы, баевікі ўсё больш актыўна выкарыстоўваюць тэракты, учыненыя з дапамогай смяротніка, прычым галоўнымі аб'ектамі выступаюць як вайскоўцы і паліцэйскія, так і паломнікі.

Не выключаны рост сутыкненняў на індыйска-пакістанскай мяжы. Рызыка вайны з Пакістанам прымушае Нью-Дэлі трымаць у штаце Джаму і Кашмір больш за 300 тысяч вайскоўцаў. Тут дыслакуецца практычна трэць асабовага складу сухапутных войскаў Індыі. Але шматлікі ваенны кантынгент не з'яўляецца стапрацэнтнай гарантыяй ад баявых дзеянняў — Пакістан таксама трымае на індыйскай мяжы значную частку сваёй сухапутнай арміі.

Міністр замежных спраў Пакістана Шах Мехмуд Курэшы заявіў, што «Індыя вядзе небяспечную гульню». Пакістанскае МЗС выпусціла заяву, у якой адзначаецца, што «акупаваны Індыяй Джаму і Кашмір застаецца спрэчнай тэрыторыяй, што прызнаецца міжнароднай супольнасцю». «Як адзін з бакоў гэтай спрэчкі Пакістан выкарыстоўвае ўсе сродкі для таго, каб супрацьстаяць гэтым незаконным крокам», — заявілі ў знешнепалітычным ведамстве.

У сваю чаргу начальнік штаба сухапутных войскаў Пакістана генерал Камар Джавед Баджва заявіў, што пакістанская армія падтрымае жыхароў індыйскага штата Джаму і Кашмір. «Мы гатовыя да любых дзеянняў для выканання нашых абавязацельстваў», — падкрэсліў генерал. Насамрэч, ваеннае ўмяшанне, прынамсі на цяперашнім этапе, калі Пакістан да яго не гатовы, — поспеху не прынясе і скончыцца разгромам пакістанскіх сіл. Узмацненне падтрымкі сепаратыстаў таксама кардынальным чынам сітуацыю не зменіць. Застаюцца толькі дыпламатычныя варыянты, а іх не так шмат. Прэм'ер-міністр Пакістана Імран Хан заявіў, што адмена Індыяй асаблівага статусу штата Джаму і Кашмір прывядзе да краху міру і стабільнасці ў рэгіёне. Ён заклікаў прэзідэнта ЗША Дональда Трампа рэалізаваць сваё абяцанне выступіць пасярэднікам паміж бакамі канфлікту. Аднак Індыя адхіляе магчымасць удзелу трэцяга боку ў вырашэнні пытання, паколькі лічыць гэта спробай умяшання ва ўнутраныя справы краіны.

Канфрантацыя паміж Індыяй і Пакістанам — дзвюма ядзернымі дзяржавамі — выклікае занепакоенасць у свеце. Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш звярнуўся да ўрадаў краін з патрабаваннем «захоўваць максімальную стрыманасць». Сітуацыя вельмі напружаная, відавочна, што кашмірскі канфлікт застаецца адной з найбольш вострых праблем у сучасных міжнародных адносінах і яго ўрэгуляванне — працэс надзвычай няпросты і доўгі.

Захар БУРАК.

Да 75-годдзя Гродзенскай вобласці

ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ

Чым захапляе выстаўка рарытэтаў ваеннай і пасляваеннай гісторыі Прынёмання

Больш за 500 экспанатаў прадстаўлена ў экспазіцыі Гродзенскай абласной бібліятэкі. Гэта фотаздымкі, прадметы побыту, паштоўкі, даведнікі, нумары газет і часопісаў. Фонды бібліятэкі дапоўнілі экспанаты з асабістых калекцый гродзенцаў Аляксандра Сявенкі і Алега Ярша. Многія здымкі даволі рэдкія.

Загадчыца аддзела мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Яўхіма Карскага Лілія ХАДАРОЎСКАЯ адчыняе шкляныя вітрыны, каб падрабязней расказаць аб унікальных экспанатах. Погляд спыняецца на «Літаратурнай Гродзеншчыне». І тут можна ўбачыць арыгінальныя здымкі, на некалькіх з іх — гродзенскія пісьменнікі Анатоль Карпюк і Васіль Быкаў. Гэта ўнікальныя фота, кажа Лілія Леанідаўна. Такіх няма нават у фондах бібліятэкі.

Са шматлікіх кніг, буклетаў найбольш каштоўнымі лічацца два выданні часопіса «Нёман» 1956 і 1958 гадоў. Дарэчы, цяпер часопіс уваходзіць у склад Выдавецкага дома «Звязда», а тады гэта былі проста зборнікі пісьменнікаў Гродзенскай вобласці.

Асабліва цікавы першы нумар. Хто тут друкаваўся? Міхась Васілёк, Аляксей Карпюк, Сяргей Бандарэнка, Васіль Быкаў з двума апавяданнямі — «Тупое пяро» і «Страта». Гартаем старонкі. У выданні нямала ілюстрацый. І яны сталі сапраўдным адкрыццём. Вось здымак доміка Элізы Ажэшкі 1950-х, які знаходзіўся каля самай дарогі. Дарэчы, пазней ён быў перанесены на дзясятак метраў далей з-за пашырэння праезджай часткі. На ілюстрацыі можна ўбачыць яго першапачатковы выгляд, прычым у даволі рэдкім ракурсе. У зборніку ёсць фота помніка пісьменніцы, які ў 1920-х быў усталяваны ў гарадскім парку, пасля вайны яго знайшлі на могілках і перанеслі ў іншае месца, непадалёк ад дома пісьменніцы. На старонках часопіса знайшла сваё адлюстраванне альтанка, дзе любіў бываць Адам Міцкевіч. Часопіс каштаваў пяць рублёў на старыя грошы, што пасля рэформы 1961 года складала 50 капеек.

Лілія Леанідаўна звяртае ўвагу на вітрыну, якая звязана з культурнымі ўстановамі горада. Тут можна ўбачыць тэатральную афішу 1950-х гадоў, якая нейкім цудам захавалася. Скрутак білетаў у кіно, адзін квіток — 20 капеек. Многія старэйшыя суайчыннікі памятаюць гэтыя квіткі пры наведванні кінатэатраў.

Даведнік па заапарку 1957 года. Што ж там было ў той час? Трымаем у руках даволі просты ў афармленні зборнік з чорна-белымі фотаздымкамі. Вядома, гэта не тыя яскравыя прыгожыя даведнікі, якія выпускаюцца зараз на глянцавай паперы з выразнымі здымкамі. Тады такіх магчымасцяў не было, але даведнік тым не менш цікавы, бо дае ўяўленне аб фаўне, якая насяляла першы ў Беларусі заалагічны парк больш за 60 гадоў таму. Згодна з інфармацыяй, тады тут налічвалася каля 100 відаў жывёл (гэта ў тры разы менш, чым цяпер). Праўда, некаторыя віды зніклі і не ўзнавіліся. Сярод іх дзікабраз, белы мядзведзь і, вядома, слон. У той час, згодна з даведнікам, гэта была сланіха Машка, а пазней тут з'явіўся Сурак. Пасля таго як слон загінуў, гэты від заапарк так і не набыў, хоць сланоўнік пабудаваны. Праўда, былі спробы купіць былога цыркавога слана, але планы не ажыццявіліся. Дарэчы, сёлета заапарку спаўняецца 90 гадоў.

Пераходзім да наступнай вітрыны. Лілія Леанідаўна бярэ ў рукі заліковую кніжку студэнта Гродзенскага педагагічнага інстытута Віталя Таранкі. Відавочна, што студэнт быў з ліку паспяховых, больш за ўсё адзнак «выдатна». Вось і апошні экзамен, які пазначаны ў залікоўцы, здадзены на «выдатна». Але далей ідуць чыстыя лісты... Лілія Леанідаўна паказвае на дату экзамену — 21 чэрвеня 1941 года. Студэнт у кароткі тэрмін з будучага педагога стаў салдатам. Гісторык-калекцыянер расказаў арганізатарам выстаўкі, што Віталь Таранка загінуў на фронце. А з таго курса вярнуўся толькі адзін студэнт...

Дарэчы, на ваенную тэму сабрана нямала экспанатаў. Узнагародныя дакументы, значкі, кнігі, брашуры. Вось, напрыклад, друкаваныя выданні. Абласная газета «Гродненская правда» за люты 1945 года. Фармат — чатыры паласы ці дзве старонкі. Што ў той час друкавалі? На паўпаласы — загад Сталіна, які аб'явіў падзяку камандуючым франтамі. Зводкі з фронту. На другой старонцы (паласе) — справаздача аб сацыялістычным спаборніцтве. У нумары невялікі крытычны артыкул аб недахопах у дзейнасці камсамольскіх арганізацый, у прыватнасці, выхаваўчай рабоце. У «падвале» друкаваліся аб'явы «патрэбны работнікі» на прадпрыемствы. Таксама ў гэтым нумары быў аб'яўлены конкурс на найлепшы праект помніка героям Айчыннай вайны, якія загінулі пры вызваленні Гродна. Работы выстаўляліся на агульны агляд. Вайна яшчэ ішла, а ўлады ўжо меркавалі, як увекавечыць памяць тых, хто здабываў перамогу. Магчыма, тады і нарадзіўся манумент, які цяпер стаіць у гарадскім парку. Ён з'явіўся ў 1949 годзе на месцы пахавання савецкіх воінаў і партызанаў.

— Кожны артыкул уяўляе з сябе цікавы гістарычны матэрыял, — каментуе выданне Лілія Леанідаўна. — Вось, напрыклад, артыкул пра пяцігадовы юбілей Беларускага ансамбля песні і танца, які стварыў Рыгор Шырма. Ён пачынаў сваю дзейнасць менавіта ў Гродне. За той час ансамблем было дадзена адна тысяча канцэртаў.

Што датычыць ваеннай тэмы, захавалася газета-плакат 1943 года. Свайго роду баявы лісток. Пад загалоўкам надпіс: «Прачытаў — перадай іншаму». Нават колер прысутнічае. Ёсць тут даведка аб знішчэнні ворага ў Баранавічах, партызанскія прыпеўкі. Вось, напрыклад, як перадаецца надпіс пад малюнкам, дзе вядуць размову маці з дзіцем. Малы пытаецца: — Мама, а куды гэтыя птушкі ляцяць? — На Берлін. — А каму яны яйкі нясуць? — Гітлеру. — А ён будзе іх есці? — Ён будзе есці гогаль-могаль, — адказвае маці. Хоць гэты лісток пад рэдакцыяй Кандрата Крапівы выдаваўся ў Мінску, ён хадзіў і па Гродзеншчыне. Бо менавіта на тэрыторыі вобласці быў знойдзены.

Газета-плакат пачатку 1945 года. На першай старонцы Стары год у вобразе партызана перадае зброю маладому байцу — Новаму 1945 году. І надпіс «Прымі і дабі». Маецца на ўвазе варожых захопнікаў.

На шкляной паліцы кідаецца ў вочы выданне з выразным надпісам «Сталинская молодежь», якое рабіў Мінскі абкам камсамола. На выстаўцы прадстаўлены экзэмпляр 1952 года. Газета «Правда» 1953 года з вялікім разваротам і фотаздымкамі пахавання Сталіна. Гродзенцы таксама выпісвалі гэтыя выданні.

Фотаздымкі закладкі Кургана Славы ў 1969 годзе. Адлюстравана, як ветэраны высыпаюць з каробачак зямлю, што прывезена з месцаў пахавання Герояў Савецкага Саюза, якія загінулі на Гродзеншчыне. У Гродне доўгі час была традыцыя — падчас шлюбу маладыя пары прыязджалі сюды і ўскладалі кветкі.

Прадстаўлена прадукцыя бярозаўскага шклозавода «Нёман». Напэўна, і цяпер у многіх сем'ях захаваліся такія шкляныя вырабы з чырвонага і каляровага шкла, якія завод выпускаў у 1940—1960-я гады. Крыху пазней, у 1970-х, у асартыменце завода адным з папулярных вырабаў былі зубры розных памераў. На выстаўцы прадстаўлены даволі масіўныя экзэмпляры гэтага волата — сімвала Гродзенскай вобласці, які красуецца на гербе рэгіёна. Такіх шкляных каляровых зуброў звычайна дарылі замежным дэлегацыям.

Лілія Леанідаўна звяртае ўвагу на рыёмнікі «Спідола», якія выпускалі ў Гродне. Калісьці было модна хадзіць з такімі рыёмнікамі на пляжы. І гэта было даволі крута.

Сапраўдны спартыўны рарытэт — афіша футбольнага матча, які праходзіў ў Гродне ў 1968 годзе на першынство СССР. Гродзенскі «Нёман» сустракаўся з камандай «Дынама» (Ленінград). Сярод экспанатаў — сапраўдныя фота чатырохразовай алімпійскай чэмпіёнкі Вольгі Корбут у момант яе трэніроўкі. Таксама на здымках можна ўбачыць вядомых гродзенскіх спартсменаў Ірыну Шылаву, Ігара Басінскага і іншых.

Выстаўка праходзіць у рамках праекта «Дакрануцца да гісторыі Прынёмання», які налічвае больш за 20 экспазіцый. Чарговая прысвечана 75-й гадавіне ўтварэння Гродзенскай вобласці. Святкаванні ў гонар юбілейнай даты пройдуць 20 верасня, а на тыдзень раней адбудзецца свята горада і фестываль кнігі, на якім арганізатары выстаўкі прадставяць частку экспанатаў.

— Няхай гродзенцы ўбачаць горад такім, якім ён быў 40—50 гадоў таму. Магчыма, для многіх гэта стане своеасаблівым падарожжам у мінулае, ускалыхне памяць. А гэта па большасці прыемныя ўспаміны, — лічыць Лілія Хадароўская.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Духоўнае

У Магілёве ўспомнілі Георгія Каніскага

Імя гэтага святара, архіепіскапа Магілёўскага і Беларускага, вядомага філосафа, педагога і грамадскага дзеяча шмат што значыць для Магілёва. Падчас служэння на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, дзе праваслаўныя падвяргаліся ганенням, ён змагаўся за роўнасць правоў вернікаў, усё сваё жыццё клапаціўся пра асвету духавенства, займаўся адукацыяй простых людзей. У 1757 годзе адкрыў у Магілёве духоўную семінарыю і арганізаваў друкарню пры архірэйскім доме. Георгій Каніскі памёр у 1795 годзе, а ў 1993 годзе быў кананізаваны праваслаўнай царквой і далучаны да ліку святых зямлі беларускай.

У памяць аб ім у Спаса-Праабражэнскім кафедральным саборы Магілёва адбылася Божая Літургія, у якой прыняў удзел Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, і адбыўся хрэсны ход са Свята-Мікольскага манастыра да дома Каніскага, дзе святіцелю Георгію адслужылі малебен. У святочным богаслужэнні прынялі ўдзел мэр Магілёва Уладзімір Цумараў і прадстаўнікі мясцовай улады. Напярэдадні дня памяці святога, 5 жніўня, у Свята-Мікольскім манастыры адбылася ўрачыстая ўсяночная служба з чытаннем акафіста Георгію Каніскаму.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ОСИПОВИЧСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ И ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В Г. ОСИПОВИЧИ И ОСИПОВИЧСКОМ РАЙОНЕ

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462

Номер лота по порядку	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы по подготовке документации (руб.)	Инженерная инфраструктура *	Ограничения (обременения) прав на земельный участок	Кадастровый номер и характеристика земельного участка
1. г. Осиповичи, ул. Центральная, 18	для строительства и обслуживания магазина по продаже продовольственных товаров (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	12749,59	1274,96	703,94	газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура	охранная зона линии электропередачи до 1000 В	724850100001003595. Площадь земельного участка – 0,1200 гектара Срок аренды – 25 лет
2. г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, 10	для строительства и обслуживания торгового объекта (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	47810,95	4781,10	1620,95	газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение, электроснабжение, транспортная инфраструктура	охранная зона линии связи и радиофикации	724850100001003761. Площадь земельного участка – 0,4500 гектара Срок аренды – 25 лет
3. г. Осиповичи, ул. Сумченко (район детского сада № 10)	для установки и обслуживания павильона модульного типа (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	330,35	49,55	1766,08	водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура	охранные зоны: сетей и сооружений водоснабжения; сетей и сооружений теплоснабжения, линии связи и радиофикации	724850100001003865. Площадь земельного участка – 0,0039 гектара Срок аренды – 10 лет
4. д. Гродзянка, ул. Советская	для установки и обслуживания павильона модульного типа (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	9,05	1,36	-	водоснабжение, транспортная инфраструктура		724880601601000384. Площадь земельного участка – 0,0100 гектара Срок аренды – 15 лет
5. д. Гродзянка, ул. Василия Хатько, 35А	для строительства и обслуживания торгового объекта (земельный участок для размещения объектов розничной торговли)	25,60	3,84	1795,16	водоснабжение, электроснабжение, связь, транспортная инфраструктура	водоохранная зона водного объекта	724880601601000404. Площадь земельного участка – 0,0300 гектара Срок аренды – 25 лет
6. г. Осиповичи, ул. Проектная, 1Б	для строительства и обслуживания автомобильной мойки (земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей)	3788,33	378,83	2467,97	водоснабжение, электроснабжение, канализация, транспортная инфраструктура		724850100001004508. Площадь земельного участка – 0,1000 гектара Срок аренды – 25 лет
7. г. Осиповичи, ул. Козловской, 46В	для строительства и обслуживания производственной базы (земельный участок для размещения объектов промышленности)	17407,43	1740,74	3029,49	водоснабжение, электроснабжение, связь, транспортная инфраструктура	охранные зоны объектов инженерной инфраструктуры, природные территории , подлежащие специальной охране**	724850100001004529. Площадь земельного участка – 0,5154 гектара Срок аренды – 25 лет
